

**Васіль Быкаў: мастак, які ляпіў чалавечыя душы** СТАР. 3



**«Звяздоўская» віктарына да 70-годдзя вызвалення!** СТАР. 4



**Штраф за смецце, каб не было пластмасавых рэк** СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. СУБОТА № 115 (27725) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# АД ПРОСТАГА ГАНДЛЮ — ДА КРЭДЫТНА-ІНВЕСТЫЦЫЙНЫХ ПРАЕКТАЎ

**Ва ўзаемадзеянні Беларусі і Кітая неабходна павялічваць прамое інвеставанне**

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прадстаўнікамі дзелавых колаў Кітайскай Народнай Рэспублікі, дэлегацыю якіх узначальваў старшыня праўлення Кітайскай нацыянальнай машынабудаўнічай карпарацыі «Сінамач» Жэнь Хунбінь, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Вітаючы прадстаўнічую дэлегацыю кітайскага бізнесу на беларускай зямлі, Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што тут яны знойдуць сферы прыкладання для самых дзелавых талентаў і ідэй. «Сённяшні візіт з'яўляецца заканамернай рэалізацыяй нашых даверных і дружалюбных дамоўленасцяў са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам і прэм'ерам дзяржсавета КНР», — сказаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што ў ліпені 2013 года кіраўнікамі Рэспублікі Беларусь і КНР была падпісана сумесная дэкларацыя, у якой закладзены асноўны прынцып узаемадзеяння дзвюх краін на перспектыву: усебаковае стратэгічнае партнёрства. У дэкларацыі адзначана агульнае імкненне Беларусі і Кітайскай Народнай Рэспублікі вывесці супрацоўніцтва на новы ўзровень з акцэнтам на інвестыцыі ў сучасныя высокатэхналагічныя праекты.

«Мы паспяхова перайшлі ад простага гандлю да рэалізацыі крэдытна-інвестыцыйных праектаў у розных сферах. Сярод іх — энергетыка, дрэваапрацоўка, будаўніцтва, транспарт, асваенне космасу. Аднак нам неабходна пашыраць узаемадзеянне ў форме прамога інвеставання», — упэўнены кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў важнасць таго, што 19 чэрвеня быў закладзены першы камень на будаўніцтве Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка, і ўчора ён падпісаў указ, звязаны з гэтым праектам. Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў, што праект павінен быць рэалізаваны ў самыя сціслыя тэрміны.

У якасці першага рэзідэнта парка выступае адзін з лідараў у сферы высокіх тэхналогій і тэлекамунікацый — кітайская карпарацыя «Хуавэй». Гэтая кампанія будзе размяшчаць у парку Цэнтр навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх распрацовак. Прычым размова ідзе не толькі аб навукова-даследчых распрацоўках, але і стварэнні гатовага прадукту. «Такі падыход у поўнай меры адпавядае нашай стратэгічнай мэце — размясціць тут самыя перадавыя тэхналогіі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Прыярытэтнымі сектарамі, якія намечана развіваць у парку, з'яўляецца электроніка, тонкая хімія, біятэхналогіі, машынабудаванне, новыя матэрыялы. Цяпер пастаўлена больш амбіцыйная задача — маштабная інфарматызацыя краіны, і гэта адзін з прыярытэтаў развіцця Беларусі. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што сваё месца ў парку змогуць заняць і праекты ў сферы інфарматызацыі. Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі створаны найбольш спрыяльныя ўмовы для рэзідэнтаў парка ў выглядзе беспрэцэдэнтных падатковых ільгот.

Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею, што пры далейшай падтрымцы кітайскага ўрада, актыўным удзеле буйнога бізнесу Кітая ў Беларусі ўжо ў бліжэйшы час будзе дадзены старт узаемавыгадным праектам.

# ЧЫТАННЕ ЯК НАСТРОЙ ЖЫЦЦЯ



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

**Акцыя «Лета з добрай кнігай», якая распачала падарожжа па краіне, арганізавана Міністэрствам інфармацыі, Мінскім гарвыканкамам, Мінскім аблвыканкамам, Саюзам пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкім домам «Звязда». Была напачатку некаторая асцярога — не зафармалізаваць бы справу. А то замест добрага эфекту і магчымых чытачоў страцім. Сёння ж у кнігі і без таго сапернікаў хапае: і інтэрнэт, і тэлевізар, а самы галоўны, пэўна, — лянота, проста нежаданне чытаць. І гаварыць на фоне сонечных летніх канікул пра вартасці, патрэбы... Ці дапамогуць размовы...**

Мінскі гарвыканкам сказаў пра «Лета з добрай кнігай» лаканічна і ясна — на людных праспектах развешаны расцяжкі пра тое, што ідзе такая вось рэспубліканская акцыя. І пачалася яна 1 чэрвеня. «Белкніга» якраз 1 чэрвеня — хоць надвор'е таму не спрыяла — разгарнула шырокі гандаль у парку імя Горкага ў сталіцы. Менавіта гандаль апошнімі кніжнымі навінкамі. Не проста кнігамі, а тымі, што адрасаваны найперш юным чытачам. Іх якраз у апошнія месяцы шмат выдадзена і ў «Мастацкай літаратуры», і ў Выдавецкім доме «Звязда», і ў «Адукацыі і выхаванні», і ў «Пачатковай школе», і ў «Народнай асвеце», і ў «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі»... СТАР. 2

### ЛІЧБА ДНЯ

***1787,4 тыс. кв. м***

***агульнай плошчы жылля было ўведзена за пяць месяцаў гэтага года, што складае 35,7% задання на год і на 7,8% перавышае ўзровень студзеня—мая 2013 года. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 897,9 тыс. кв.м агульнай плошчы, або 50,2% агульнага аб'ёму ўведзенага жылля, у тым ліку з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі — 702 тыс. кв.м, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 595,4 тыс. кв.м. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 414,8 тыс. кв.м агульнай плошчы жылля.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.06.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10180,00 | ▲ |
| Еўра | 13860,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 296,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 858,71 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +19° |
| Віцебск | +15° |
| Гомель | +20° |
| Гродна | +18° |
| Магілёў | +18° |
| Мінск | +17° |

# НА ХВАЛІ ДРУЖБЫ І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

**Азербайджан для Беларусі з'яўляецца адной з прыярытэтных дзяржаў для развіцця супрацоўніцтва. Пра гэта кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Азербайджана Артурам Расі-задэ, паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт падкрэсліў, што для Беларусі Азербайджан з'яўляецца адной з блізкіх краін, а паміж лідарамі дзвюх дзяржаў традыцыйна існуюць добрыя адносіны. «У нас вельмі паспяхова развіваецца супрацоўніцтва ва ўсіх сферах. Нягледзячы на пэўныя складанасці і праблемы (а яны заўсёды існуюць), нам удалося пазбегнуць закрытых тэм у нашым супрацоўніцтве. Мы абсалютна адкрыты для вас, няма той наменклатуры тавараў, якіх мы не можам пастаўляць вам або якіх вы не можаце прадаваць у нас, няма забароненых тэм для стварэння сумесных прадпрыемстваў, што мы і робім у Азербайджане», — адзначыў беларускі лідар.

«Хачу вас папрасіць, каб вы памяталі, што ў вас ёсць вельмі блізкая краіна Беларусь і сюды можна прыходзіць з інвестыцыямі, мы заўсёды будзем вас падтрымліваць. Вы павінны разумець, што мы для вас з'яўляемся самым блізкім сябрам і зацікаўлены ў вырашэнні ўсіх вашых праблем, нават самых вострых. І калі мы нешта зможам зрабіць у гэтым плане, вы можаце на нас разлічваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, Артур Расі-задэ адзначыў, што Азербайджан вельмі высока цэніць адносіны з Беларуссю і гатовы гэтыя адносіны развіваць надалей і ў сферы палітыкі, і эканомікі, і ў гуманітарнай сферы.

■ Абітурыент-2014

# Мікалай ФЯСЬКОЎ: «У НАС ДЗЕЙНІЧАЕ СВАЯ СЛУЖБА БЯСПЕКІ»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Расіі адзіны дзяржаўны экзамен выйшаў на фінішную прамую. Калі сталі вядомыя вынікі ўдзельнікаў АДЭ па рускай мове і матэматыцы, Федэральная служба па наглядзе ў сферы адукацыі была вымушана знізіць парогавы мінімум па гэтых прадметах: па рускай мове з 36 да 24 балаў, а па матэматыцы — з 24 да 20 балаў. Інакш бы без школьных атэстатаў засталася вялікая колькасць выпускнікоў...**

**Асноўнай прычынай змяншэння колькасці балаў у гэтым годзе называюць спадзяванні школьнікаў і настаўнікаў на тое, што экзамен удасца спісаць — таксама, як і летась. Многія спадзяваліся, арыентуючыся на папярэдні год, што ў інтэрнэце можна будзе знайсці сапраўдныя адказы. На ўцечку інфармацыі спадзяваліся цэлыя рэгіёны. Хтосьці чакаў, што зможа ўзяць мабільны тэлефон, патэлефанаваць і атрымаць адказы...** СТАР. 2

■ Курсавая розніца

# РОСТ НАФТЫ НЕПАКОІЦЬ РЫНАК

**Долар можа вярнуць свае пазіцыі, а еўра без дадатнага гандлёвага балансу не паздаровіцца. У гэты ж час расійскі рубель мае вялікія шанцы на рост.**

Так можна коратка апісаць вынікі тыдня на валютным рынку. Выклікана сітуацыя некалькімі фактарамі. Па-першае, вяртанне кіраўніцтва Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША да жорсткай рыторыкі, а ў хуткім часе, відаць, і палітыкі стала нагодай для новай плыні даверу да амерыканскай валюты. Некаторыя аналітыкі лічаць, што слабасць долара часовая, што ён «прайграў бой, але выйграе вайну». Паглядзім.

У сваю чаргу Еўрапейскі Цэнтрабанк вычарпаў усе козыры і, давёўшы эканоміку да адмоўных працэнтных ставак, чакае, што будзе далей. Галоўная аснова, на якой еўра можа ўтрымацца на вышыні, — знешні гандаль. А зрабіць сальда дадатным складана — занадта моцная валюта гэтаму будзе перашкаджаць.

Растуць цэны на нафту — абвастрэнне сітуацыі ў Іраку дае плён. І гэта карысна для расійскага рубля. Хоць у расійскай эканоміцы сваіх праблем хапае, нафтавы фактар можа даволі працяглы час падтрымліваць «драўлянага».

А вось паводзіны нашай айчыннай валюты апошнімі днямі не зусім адпавядалі сусветным тэндэнцыям. Долар адносна беларускага рубля вырас на 30 грашовых адзінак (плюс 0,3%) да 10180. Еўра паднялося на 90 рублёў (плюс 0,7%) да 13860. Расійскі рубель, які то падаў, то падымаўся цягам тыдня, дадаў 0,5 рубля (плюс 0,2%) і цяпер каштуе 296 беларускіх грашовых адзінак.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ДЗЕСЯЦЬ ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛІ Ў ВЫНІКУ ПАВОДКІ Ў БАЛГАРЫІ



Больш за дзесяць чалавек, у тым ліку адно дзіця, загінулі ў выніку паводкі ў Балгарыі. У паліцыі адзначылі, што колькасць ахвяр можа ўзрасці. Паводка, выкліканая праліўнымі дажджамі, нанесла найбольшую шкоду партоваму гораду Варна, размешчанаму на ўзбярэжжы Чорнага мора. Там патокамі вады змыты машыны, затоплены вуліцы і дамы. Некаторыя раёны горада засталіся без электрычнасці.

### АНКОЛАГІ: ДОЎГА СЯДЗЕЦЬ НА АДНЫМ МЕСЦЫ НЕБЯСПЕЧНА

Калі чалавек многа сядзіць, то ён можа захварэць на рак, дыябет і атрымаць захворванні сэрца, папярэджвае The Telegraph. Кожныя дадатковыя дзве гадзіны ў крэсле звязаны з 10-працэнтным павышэннем рызыкі развіцця раку эндаметрыя, з 8-працэнтнай рызыкай раку кішэчніка і 6-працэнтнай рызыкай раку лёгкіх. Эфект ніяк не залежаў ад таго, колькі чалавек трэніраваўся за дзень. Самі па сабе працяглыя перыяды зніжанай рухомасці былі небяспечныя, сведчаць назіранні больш чым за 4 мільёнамі людзей і амаль за 70000 ракавых хворых. Больш за ўсё на павышэнне рызыкі раку кішэчніка і эндаметрыя ўплываў прагляд тэлевізара. Магчыма, сваю лепту ўносіла звычка есці перад тэлевізарам шкодную ежу і піць салодкія напоі. Самымі нізкімі паказчыкамі лічыліся 2-3 гадзіны. Павелічэнне працягласці на дзве гадзіны ў дзень звыш гэтага паказчыка адназначна павышала рызыку раку.



## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### КІТАЙ ПАСТАВІЦЬ ЧАТЫРЫ ПЛАТФОРМЫ Ў СПРЭЧНЫХ ВОДАХ

**Кітай накіруе чатыры нафтавыя вышкі ў Паўднёва-Кітайскае мора, нягледзячы на тое, што яшчэ не прайшло і двух месяцаў пасля крывавых пагромаў у В'етнаме, справакаваных хваляй пратэстаў з-за ўстаноўкі КНР глыбакаводнай буравой платформы ў гэтым спрэчным раёне.**

Платформы «Наньхай-2» і «Наньхай-5» плануецца размясціць у раёне вострава Дунша, паведаміла Упраўленне марской паліцыі Кітая. Платформа «Наньхай-9» будзе ўсталявана недалёка ад в'етнамскай эканамічнай зоны, гаворыцца ў паведамленні. Аб планах Кітая па ўстаноўцы буравых платформаў было абвешчана ў разгар тэрытарыяльнай спрэчкі з нагоды астравоў у Паўднёва-Кітайскім моры і прэтэнзій многіх краін Азіі, у прыватнасці, В'етнама і Філіпін, з нагоды росту актыўнасці Пекіна ў рэгіёне. Жорсткае супрацьстаянне паміж В'етнамам і Кітаем пачалося ў мінулым месяцы пасля таго, як КНР паставіла глыбакаводную ўстаноўку «Хаян Шыю-981» у 240 км ад узбярэжжа суседняй краіны. З таго часу паміж бакамі, па звестках МЗС КНР, на моры адбылося больш за тысячу сутыкненняў.

## КОРАТКА

Даручэнне па павелічэнні ўдзельнай вагі тавараў айчыннай вытворчасці да 85 працэнтаў у магазінах і аб'ектах грамадскага харчавання сталіцы дадзена ў час нарады па пытаннях далейшага развіцця спажывецкага рынку Мінска.

Валавы ўнутраны прадукт Беларусі за студзень-май бягучага года павялічыўся на 1,5 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2013-га да Br264 трлн 693,7 млрд.

Беларусь 20 чэрвеня ў мэтах выканання сваіх абавязацельстваў па крэдыце стэнд-бай Міжнароднага валютнага фонду ажыццявіла чарговае пагашэнне асноўнага доўгу ў памеры 54,7 млн СДР, што эквівалентна $84,3 млн.

Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь закупіла партатыўныя аўтамабільныя загароды «Ліяна». З іх дапамогай плануецца спыняць браканьераў, якія паспрабуюць уцячы з месца здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў на аўтамабілях.

# ГАНАРЫЦЦА МІНУЛЫМ — БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ

1944-2014 70 гадоў вызвалення

**У нашай краіне з'явіцца помнік вайскоўцам, якія ў першыя дні вайны змагаліся за Радзіму**

**Заўтра амаль увесь свет узгадае трагічную дату: 73 гады таму, на самым золку, гітлераўская Германія напала на Савецкі Саюз. «Вайна...», — аб'явіў Молатаў, тагачасны міністр замежных спраў. Ніхто не верыў, што гэта праўда. Ніхто не мог падумаць, што трагедыя зацягнецца так надоўга. Здавалася, у той вайне цяжка перамагчы...**

**І вось мы святкуем яшчэ адзін юбілей — вельмі знакавы ў гісторыі нашай краіны. 23 чэрвеня 1944 года пачалася Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён». Асновы перамогі Савецкага Саюза над нямецкім ворагам былі закладзены, доўгачаканы дзень набліжаўся.** СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 57 000 | 171 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 51 300 | 153 900 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 125 000 | 375 000 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 112 500 | 337 500 |

■ Ва ўрадзе

# Парад да Дня Незалежнасці пройдзе ўвечары

## А 2 ліпеня ўрачыста адкрыецца новы будынак Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

**Учора ў Савеце Міністраў адбылося пасяджэнне аргкамітэта па падрыхтоўцы да святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі. Стала вядома, што парад і тэатралізаванае шэсце ў гонар Дня Незалежнасці 3 ліпеня ў Мінску сёлета пройдуць бліжэй да канца дня.**

### ЧАКАЕЦЦА ШМАТ ЗАМЕЖНЫХ ГАСЦЕЙ

«Правядзенне парада і тэатралізаванага шэсця будзе ссунута бліжэй да канца дня. У нас атрымаецца цэлы блок мерапрыемстваў, якія будуць ісці адно за другім», — сказаў **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ.** Як і раней, у цэнтры Мінска адбудзецца святочны канцэрт у раёне скрыжавання праспектаў Пераможцаў і Машэрава. Традыцыйна на працягу ўсяго дня розныя святочныя мерапрыемствы пройдуць на іншых пляцоўках ва ўсіх раёнах сталіцы.

Міністр удакладніў, што 1 ліпеня пройдзе канцэрт у Палацы Рэспублікі з удзелам расійскіх артыстаў. Чакаецца шмат гасцей з блізкага і далёкага замежжа. Барыс Святлоў таксама пацвердзіў, што 2 ліпеня ўрачыста адкрыецца новы будынак Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. «Магу сказаць, што ва ўрачыстым адкрыцці музея будзе прымаць удзел не толькі кіраўнік Беларусі, але і расійскі прэзідэнт», — паведаміў міністр .

Акрамя таго, ён адзначыў, што «гэтая дата не столькі абавязвае, колькі знутры выклікае жаданне адрэагаваць належным чынам, каб гэта сапраўды атрымалася «па-людску». Таму былі абмеркаваны ўсе пытанні дапамогі і падтрымкі ветэранаў, арганізацыі святочных мерапрыемстваў».

### МОЛАДЗІ ВАРТА МЕЦЬ СТАСУНКІ З ВЕТЭРАНАМІ

«Абгрунтаваных скаргаў ад ветэранаў з нагоды адсутнасці ўвагі да іх не паступае», — заявіў **старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Анатоль НОВІКАЎ.** Ён выказаў падзяку Міністэрству працы і сацыяльнай абароны, мясцовым уладам, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Белаграпрамбанку і ўсім, хто аказвае розную дапамогу і падтрымку ветэранам. Кіраўнік савета нагадаў, што ўжо цяпер ветэраны атрымліваюць матэрыяльную дапамогу да юбілейнай даты: «Героі Савецкага Саюза — 10 мільёнаў, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны (франтавікі і партызаны) — 8 мільёнаў, працаўнікі тылу — 3,5 мільёна. Але ж наперадзе яшчэ 70-годдзе Перамогі. Да гэтай даты таксама будуць аказваць матэрыяльную дапамогу».

Старшыня Рэспубліканскага савета паведаміў, што ва ўрачыстасцях у гонар 70-годдзя вызвалення Беларусі будуць удзельнічаць прыкладна 90% ветэранаў краіны. Астатнія альбо будуць за межамі рэспублікі, альбо ім проста цяжка выходзіць з дому з-за ўзросту. Нагадаем, што ў Беларусі засталося каля 20 тысяч ветэранаў. З іх непасрэдных удзельнікаў вайны, франтавікоў і партызанаў — 14 тысяч. «Калі ім у канцы вайны было па 20 гадоў, то дадайце 70... У нас каля 5 тысяч ветэранаў за год адыходзіць», — сказаў Анатоль Новікаў. Ён заклікаў моладзь да стасункаў з ветэранамі: «Яны вам нешта распавядуць. Запішыце гэты аповед і аддайце запіс у музей. У кожнай школе ёсць музей. Гэта ж гісторыя».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

■ Парламенцкі дзённік

# ТРЫ «КІТЫ» АДЗІНАЙ КАНКУРЭНТНАЙ ПАЛІТЫКІ

**Напярэдадні падпісання пагаднення аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза, у снежні 2013 года, кіраўнікі Беларусі, Казахстана і Расіі прынялі рашэнне аб перадачы Еўразійскай эканамічнай камісіі паўнамоцтваў па кантролі за захаваннем адзіных правілаў канкурэнцыі на трансгранічных рынках. Па сутнасці, размова ідзе пра стварэнне адзінага наднацыянальнага антыманапольнага органа на тэрыторыі ЕАЭС.**

**Якім чынам Еўразійская эканамічная камісія будзе рэалізоўваць антыманапольнае рэгуляванне і ці спатрэбіцца дадатковая карэкціроўка нацыянальнага антыманапольнага заканадаўства — высвятлялі дэпутаты ніжняй палаты беларускага парламента на пашыраным пасяджэнні дзвюх Пастаянных камісій — па эканамічнай палітыцы і па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.**

— Наша экспартаарыентаваная эканоміка ў значнай ступені залежыць ад сітуацыі на міжнародных рынках. Стварэнне адзінай эканамічнай прасторы ўзмацняе ступень узаемнага пранікнення эканомік трох краін. Таму паўстала першачарговая неабходнасць гарманізацыі заканадаўства з пункту гледжання стварэння адзіных прынцыпаў канкурэнтнай палітыкі. Гэта павінна садзейнічаць далейшаму развіццю канкурэнтаздольнасці беларускіх прадпрыемстваў, — упэўнены **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК.**

Адзіная канкурэнтная палітыка азначае, што адпаведнае заканадаўства любой краіны — удзельніцы Еўразійскага саюза аднолькавым чынам распаўсюджваецца на суб'екты гаспадарання іншых краін-удзельніц, незалежна ад месца рэгістрацыі і формы ўласнасці. Гэта значыць, што, калі суб'ект гаспадарання зарэгістраваны ў Казахстане, а працуе ў Беларусі, беларускае антыманапольнае заканадаўства будзе прымяняцца да яго гэтак жа, як і да беларускіх суб'ектаў гаспадарання. Тое самае датычыцца Расіі і Казахстана.

Еўразійская эканамічная камісія будзе праводзіць расследаванні і накладаць штрафныя санкцыі толькі па трох відах парушэнняў: антыканкурэнтнае пагадненне; злоўжыванне дамінуючым палажэннем і нядобрасумленная канкурэнцыя. Штрафы будуць плаціцца ў бюджэт той краіны, дзе зарэгістраваны парушальнік. Калі, напрыклад, беларускі суб'ект гаспадарання парушае правілы канкурэнцыі ў Казахстане і камісія вынесла рашэнне пакараць гэты суб'ект, то штраф паступіць у Беларусь.

Кампетэнцыя камісіі — дзейнасць трансгранічных рынкаў, якія распаўсюджваюцца на тэрыторыю дзвюх і больш дзяржаў. Для Беларусі гэта ў асноўным рынак фасфарытаў, міжнародных авія- і чыгуначных перавозак, харчовых тавараў, паслуг міжнароднай сувязі (роўмінгу), вытворчасць сінтэтычных мыйных сродкаў і інш.

Усё, што датычыцца парушэння канкурэнцыі ўнутры краіны, разглядаецца ў рамках нацыянальнага заканадаўства. У адрозненне ад нацыянальнага антыманапольнага заканадаўства, Еўразійская эканамічная камісія не зможа прыцягваць парушальнікаў да крымінальнай адказнасці.

Згодна з Пагадненнем аб адзіных прынцыпах і правілах канкурэнцыі, дзяржаўнае цэнавае рэгуляванне ў краінах — удзельніцах ЕАЭС дазваляецца ў выключных выпадках не часцей за адзін раз у год і не больш, чым на 90 дзён. Гэтае абмежаванне не закранае дзяржаўнае цэнавае рэгуляванне на паслугі, у тым ліку паслугі суб'ектаў натуральных манаполій (транспарт нафты і газу па трубаправодах, перадача электраэнергіі, водазабеспячэнне, сувязь, чыгунка, паветраны рух), а таксама на прыродны газ і звадкаваны газ для бытавых патрэб, электрычную і цеплавую энергію, пэўныя віды алкагольнай прадукцыі, этылавы спірт, лекі, паліва, прадукцыю ядзерна-энергетычнага цыкла і нафтапрадукты. На гэтыя віды паслуг і тавараў дзяржавы могуць рэгуляваць цэны цалкам самастойна.

Мадэльны Закон «Аб канкурэнцыі» прадугледжвае рэалізацыю беларускім заканадаўствам наступных нормаў: антыманапольнае патрабаванне да таргоў, антыманапольны кантроль за стварэннем дзяржаўных прадпрыемстваў, праграма змякчэння адказнасці за парушэнні антыманапольнага заканадаўства.

Для простага абывацеля інтарэс у развіцці канкурэнцыі заключаецца ў зніжэнні цэн на тавары і паслугі. Напрыклад, на асобных авіямаршрутах, дзе ўдзельнічаюць толькі два перавозчыкі, цэны вышэйшыя, чым на такіх жа па адлегласці маршрутах, якія эксплуатуе большая колькасць перавозчыкаў. Розніца ў кошце білетаў дасягае 50%.

**Еўразійская эканамічная камісія будзе праводзіць расследаванні і накладаць штрафныя санкцыі толькі па трох відах парушэнняў: антыканкурэнтнае пагадненне; злоўжыванне дамінуючым палажэннем і нядобрасумленная канкурэнцыя.**

Захаванне адзіных прынцыпаў канкурэнцыі павінна быць цікавым і для дзяржавы, запэўніў дэпутатаў **Аляксандр КУРЫЛЬЧЫК, які выконвае абавязкі намесніка дырэктара дэпартамента антыманапольнага рэгулявання Еўразійскай эканамічнай камісіі**. Гэта дэманструе выпадак з апатытавым канцэнтратам, які Гомельскі хімічны завод закупляе ў Расіі ў самых вялікіх аб'ёмах і па самых вялікіх цэнах, губляючы на гэтым дзясяткі мільёнаў долараў штогод.

— Перадача ЕЭК паўнамоцтваў па кантролі за захаваннем адзіных прынцыпаў і правілаў канкурэнцыі павінна адбыцца да першага ліпеня, але ў асноўным яно ўжо, можна сказаць, вырашана, — сказаў Аляксандр Курыльчык. — Кіраўнікамі дзяржаў падпісана рашэнне аб перадачы паўнамоцтваў, яно ўступіць у сілу праз 10 дзён пасля падпісання пагаднення аб парадку абароны канфідэнцыяльнай інфармацыі і адказнасці за яе раскрыццё. Цяпер адбываецца вызначэнне службовых асоб, якім кіраўнікі трох дзяржаў дэлегуюць права падпісання вышэйзгаданага пагаднення.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

■

# ЧЫТАННЕ ЯК НАСТРОЙ ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзіцячая кніга — адзін з прыярытэтных напрамкаў у дзяржаўнай выдавецкай галіне. Многія аўтары, дарэчы, вядомы не толькі ў Беларусі, але ў іншых краінах свету. Толькі аповесць «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» Алеся Бадака ў апошнія некалькі гадоў выйшла на рускай, таджыкскай, венгерскай і іншых мовах. Зусім нядаўна надрукавана па-ўкраінску ў часопісе «Кіеў». Чытаеш яе — і згадваеш добрыя кнігі Івана Сяркова, Альберта Ліханава, Анатоля Алексіна. «А мы зараз праводзілі ўнутрыбібліятэчны рэйтынг, — расказвае кіраўнік сістэмы дзіцячых бібліятэк Мінска Таццяна Швед, — і бачым, з якой ахвотай звяртаюцца самыя юныя да кніг Наталлі Ігнаценкі, Алены Масла, Алены Туравай... Рады хлопчыкі і дзяўчынкі і новаму дзіцячаму часопісу «Буся».

Відаць, чытачы ў друкаванай кнігі ўсё ж ёсць. І іх, магчыма, будзе яшчэ болей, калі добрымі дарадцамі ў арганізацыі дзіцячага чытання выступяць дарослыя — і настаўнікі, і бібліятэкары, і самі пісьменнікі. Алена Стэльмах, намеснік дырэктара Выдавецкага дома «Звязда», разам з групай дзіцячых паэтаў, празаікаў ужо другі тыдзень вандруе па дзіцячых аздараўленчых летніках Міншчыны. Правядзенню акцыі выдатна спрыяе Мінскі аблвыканкам. І арганізатары ідэалагічнай работы, і кіраўнікі педагагічнай галіны, і культасветработнікі — усе паядналіся ў адным разуменні, што для дзіцячага выхавання кніга сёння як ніколі патрэбна. Таму, мусіць, такім шматлюдным і атрымалася свята кнігі, якое ва Уздзе ў рамках акцыі «Лета з добрай кнігай» арганізавалі па ініцыятыве дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіслава Цыдзіка. Песенная ўздзенская старонка — гэта радзіма Пятра Глебкі, Алеся Махнача, Антона Бялевіча, Кандрата Крапівы... У кожнага са згаданых творцаў ёсць вершы і апавяданні для дзяцей. Традыцыі легендарных землякоў працягваюць і шмат хто з нашых сучаснікаў. А самая галоўная традыцыя, якая, несумненна, павінна развівацца і прадаўжацца: кніга — крыніца выверaных, дакладных ведаў, але і крыніца пачуццяў, школа дабрыні і светласці. Як гэтую традыцыю зрабіць важнай і неабходнай часткай жыцця ў сям'і і грамадстве — клопат для ўсіх, хто думае пра будучыню.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# «У НАС ДЗЕЙНІЧАЕ СВАЯ СЛУЖБА БЯСПЕКІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Дарэчы, колькасць работ, напісаных на высокія балы, зменшылася ў нашых суседзяў у дзясяткі разоў: абсалютны вынік (100 балаў) па матэматыцы змаглі набраць толькі 64 выпускнікі (летась такіх было 500 чалавек). А па некаторых прадметах колькасць стабальнікаў скарацілася ў 50 (!) разоў.**

**Прадстаўнікі Федэральнай службы па нaглядзе ў сферы адукацыі сцвярджаюць, што ўпершыню Адзіны дзяржаўны экзамен прайшоў максімальна празрыста і аб'ектыўна і паказаў рэальную карціну ведаў выпускнікоў. Таму розніцу паміж сёлетнімі і мінулагоднімі ацэнкамі на Адзіным дзяржаўным экзамене можна лічыць індыкатарам махлярства і карупцыі, якія суправаджалі АДЭ ў папярэднія гады.**

— Звычайна настаўнікі і бацькі выпускнікоў праводзяць аналогіі паміж нашым цэнтралізаваным тэсціраваннем і Адзіным дзяржаўным экзаменам у Расіі. Таму мы заўсёды ўважліва сочым за падзеямі ў суседняй краіне, дзе Адзіны дзяржаўны экзамен пакуль не змог заваяваць давер у грамадскасці, і тут жа праецыруем іх падзеі на нас, — расказаў журналісту «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Скажам, калі ў нашых суседзяў пайшла мода выкладваць у інтэрнэт матэрыялы экзаменацыйных заданняў, ёсць верагоднасць, што гэты «вірус» можа закрануць і нас. Значыць, мы павінны працаваць на папярэджанне... Упэўнены, што любы факт выкладвання падчас ЦТ у інтэрнэце зместу экзаменацыйнага тэста будзе ўспрыняты і грамадскасцю, і дзяржаўнай камісіяй як надзвычайнае здарэнне, нават нягледзячы на тую акалічнасць, што скарыстацца выкладзенай у сусветным павуцінні інфармацыяй ніхто не паспее. Таму мы і не можам дапусціць такі прэцэдэнт.

***— Але ў Расіі ў гэтым годзе было прынята шмат новых захадаў, каб папярэдзіць магчымыя ўцечкі інфармацыі з экзаменацыйных аўдыторый: на ўваходах устанаўліваліся металічныя рамкі, на экзамене вялося відэаназіранне; быў уведзены нават інстытут анлайн-назіральнікаў, якія сачылі за парадкам у аўдыторыях праз інтэрнэт і маглі перадаць свае заўвагі ў гарадскія і рэгіянальныя экзаменацыйныя камісіі...***

— Устаноўка металадэтэктараў, безумоўна, добры сродак для кантролю за тым, што абітурыенты праносяць у аўдыторыі, аднак ён вымагае істотных матэрыяльных укладанняў і ўсё роўна не дае стапрацэнтнай гарантыі. Мы даўно пераканаліся, што самы дзейсны спосаб папярэдзіць магчымыя парушэнні ў аўдыторыі — гэта няўхільна выконваць усе нормы «Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання». Паверце, што кожны радок, кожная ўнесеная ў гэты дакумент карэкціроўка і дапаўненне з'явіліся там у выніку нашай шматгадовай практыкі правядзення цэнтралізаваных іспытаў. І для таго, каб не дапусціць уцечкі зместу тэстаў з экзаменацыйнай аўдыторыі, дастаткова, каб у аўдыторыі прысутнічалі адказныя арганізатары. Праносіць, а таксама выкарыстоўваць у аўдыторыях, дзе праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне, любыя прадметы, акрамя пашпарта, пропуска і ручкі з чарнілам чорнага колеру, забараняецца. З'яўленне любога іншага прадмета на стале — падстава для адхілення абітурыента ад здачы экзамену. **У нас ёсць пункты правядзення ЦТ, дзе заўсёды ёсць адхіленыя ад здачы экзамену: і зусім не таму, што ўсе парушальнікі сабраліся менавіта ў гэтай аўдыторыі, а таму, што арганізатары ў аўдыторыі — прынцыповыя і адказныя.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Расіі сёння спрабуюць змагацца з мабільнымі тэлефонамі на экзамене. А на цэнтралізаваным тэсціраванні выяўленне мабільнага тэлефона ў экзаменацыйнай аўдыторыі заўсёды азначала толькі адно — адхіленне ад далейшага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні і выдаленне з аўдыторыі. Прычым для нас не мае значэння: званіў тэлефон ці не, карыстаўся абітурыент сваім мабільнікам падчас экзамену ці проста трымаў яго ў сваёй кішэні. Былі выпадкі, калі мабільны тэлефон званіў пасля таго, як абітурыент здаў сваю тэставую работу, але не паспеў выйсці з аўдыторыі. Усё адно — тэставая работа ў гэтым выпадку анулюецца без права пераздачы тэсціравання ў рэзервовы дзень.

***— А чаму вы забараняеце праносіць мабільныя тэлефоны на рэпетыцыйнае тэсціраванне?***

— З аднаго боку, у атрыманні аб'ектыўнага выніку падчас «рэпетыцыі» экзамену зацікаўлены, галоўным чынам, сам абітурыент. Таму наўрад ці хтосьці стане выкарыстоўваць мабільны тэлефон для таго, каб атрымаць на «рэпетыцыі» больш высокі бал.

**«Быў выпадак, калі падчас рэпетыцыйнага тэсціравання па фізіцы ў інтэрнэце з'явіліся адразу восем фатаграфій тэстаў. Мы вылічылі і ўстанову адукацыі, і экзаменацыйную аўдыторыю, і чалавека, які зрабіў фатаграфіі, яшчэ да заканчэння рэпетыцыйнага экзамену»**

Але некаторыя ўдзельнікі рэпетыцыйнага тэсціравання фатаграфуюць экзаменацыйныя тэсты, каб потым выкласці іх змест у інтэрнэт. І гэтая тэндэнцыя нас вельмі трывожыць. Акрамя таго, што ў такой сітуацыі парушаюцца нашы аўтарскія правы, Рэспубліканскаму інстытуту кантролю ведаў, калі не спыніць такую «самадзейнасць», давядзецца хутка выстаўляць новыя варыянты тэстаў ужо не толькі на кожны з трох раўндаў рэпетыцыйнага тэсціравання, а значна часцей. Таму мабільныя тэлефоны знаходзяцца ў нас пад забаронай і на рэпетыцыйным тэсціраванні.

Але мы глядзім яшчэ далей: наша задача — не дапусціць нематываваны выкід матэрыялаў ЦТ у сацыяльныя сеткі. Нават калі б такое адбылося, то за час здачы экзамену наўрад ці хтосьці паспее выкласці ў інтэрнэт правільныя адказы, а абітурыенты наўрад ці паспеюць імі скарыстацца, аднак непрыемны асадак пасля гэтага ўсё роўна застаўся б. Мы хочам давесці працэс да аўтаматызму: **як толькі абітурыент уваходзіць у экзаменацыйную аўдыторыю, не мае значэння, якое тэсціраванне там праводзіцца (рэпетыцыйнае або цэнтралізаванае), пры ім не павінна быць ніякіх іншых старонніх прадметаў.**

Больш за тое, мы пайшлі яшчэ далей і забаранілі мець пры сабе ў экзаменацыйных аўдыторыях мабільныя тэлефоны не толькі абітурыентам, але і педагогам-арганізатарам, якія сочаць падчас выпрабаванняў за парадкам у аўдыторыях. Ім нельга мець з сабой таксама ручкі чорнага колеру, каб ніхто іх ні ў чым нават не западозрыў. І «профіль» падрыхтоўкі педагога не павінен супадаць з профілем экзаменацыйнай дысцыпліны: скажам, філолагі прысутнічаюць на ЦТ па матэматыцы, а біёлагі — на гісторыі Беларусі.

Прызнаюся, што супрацоўнікі нашага інстытута пастаянна адсочваюць правядзенне ўступных выпрабаванняў у іншых краінах як на прадмет іх арганізацыі, так і на прадмет выяўлення «слабых месцаў». Лепш вучыцца на чужых памылках, чым на сваіх.

Тым, як супрацьстаяць выкарыстанню тэхнічных сродкаў на экзаменах, заклапочаны абсалютна ўсе краіны. Пра шпаргалкі на нагах усе добра ведаюць, але, напрыклад, у адной кітайскай правінцыі дзяўчатам на экзаменах забаранілі нашэнне аднаго з прадметаў ніжняй бялізны, якое некаторыя прыгажуні выкарыстоўваюць для захоўвання там шпаргалак. У той жа Расіі на якія толькі хітрыкі абітурыенты не ідуць, бо тэхнічны прагрэс на месцы не стаіць, і нават звычайныя на першы погляд упрыгажэнні могуць служыць прыёмнай антэнай, а ў гадзінніку на руцэ можа хавацца прыстасаванне для захоўвання інфармацыі.

***— Летась нашы суседзі ўсур'ёз абмяркоўвалі выкарыстанне «глушылак», каб удзельнікі экзамену не маглі «выйсці на сувязь» з экзаменацыйнай аўдыторыі...***

— Далей абмеркавання справа не пайшла, паколькі частата з'яўляецца чыёйсьці ўласнасцю. Тэхнічна гэта можна зрабіць, а як гэта зрабіць юрыдычна, без парушэння чужых інтарэсаў? Трэба дамаўляцца з мабільнымі аператарамі, сілавымі структурамі, структурамі, якія ажыццяўляюць паветраныя перавозкі пасажыраў, ці як? Таму я па-ранейшаму настойваю на тым, што ўсё залежыць ад арганізатараў у аўдыторыі: сфатаграфаваць, перадаць і атрымаць інфармацыю незаўважна немагчыма, калі, вядома, арганізатары сумленна падыходзяць да сваіх абавязкаў. І каб выявіць парушальнікаў, зусім не абавязкова ўстанаўліваць відэакамеры: з аднаго боку, гэта, безумоўна, дысцыплінуе ўдзельнікаў экзамену, але цікава, што можна разгледзець, калі ў аб'ектыў камеры трапляе толькі нахіленая галава абітурыента і раскладзеныя перад ім лісты паперы? Я чытаў у расійскіх СМІ, што па інтэрнэце гуляе запіс, на якім юнак сядзіць на экзамене чамусьці збоку за сталом, але што ён робіць, убачыць немагчыма, бо не ўсё трапляе ў поле зроку камеры.

***— А яшчэ ў Расіі была арганізавана служба маніторынгу, спецыялісты якой пад выглядам выпускнікоў кантактуюць ва ўсіх групах і суполках, дзе абмяркоўваюцца пытанні АДЭ...***

— У нашым інстытуце ёсць свая служба бяспекі, якая ажыццяўляе кантроль за ўсімі электроннымі сродкамі, што выкарыстоўваюць несумленныя абітурыенты або рэпетытары, якія прыходзяць на тэсціраванне. Усё, што тычыцца тэсціравання, адсочваецца ў інтэрнэце. Так званымі «адказамі» да тэстаў у нас ужо не гандлююць, бо ўсе пераканаліся, што здабыць іх да экзамену немагчыма. І калі ў інтэрнэце з'явяцца прапановы «купіць» правільныя адказы, гэта будзе адназначна махлярствам. Але вось, напрыклад, быў выпадак, калі падчас рэпетыцыйнага тэсціравання па фізіцы ў інтэрнэце з'явіліся адразу восем фатаграфій тэстаў. Нашы спецыялісты вылічылі і ўстанову адукацыі, і экзаменацыйную аўдыторыю, і чалавека, які зрабіў фатаграфіі, яшчэ да заканчэння рэпетыцыйнага экзамену.

Прызнаюся, што заваяваць давер да ЦТ з боку абітурыентаў, іх бацькоў, педагагічнай грамадскасці было вельмі няпроста. Таму мы вельмі даражым сваёй рэпутацыяй...

***— Мікалай Сцяпанавіч, не магу абмінуць яшчэ адну вельмі «папулярную» ў абітурыенцкім асяродку тэму — магчымасць угадвання на ЦТ правільных адказаў. Ці насамрэч гэта магчыма?***

— Самым распаўсюджаным міфам з'яўляецца меркаванне, што можна быць абсалютна недасведчаным у пэўнай галіне ведаў і, разам з тым, на тэсціраванні «натыкаць» на мінімальны прахадны бал. Перш за ўсё адзначу, што выраз «угадаць» не зусім да месца, калі мы маем на ўвазе адказы абітурыента на пытанні тэставых заданняў падчас запаўнення бланкаў. Угадаць можна, які нумар аўтобуса на гарадскім маршруце першы пад'едзе да прыпынку ці колькі пешаходаў зможа перайсці вуліцу на зялёнае святло святлафора.

Пры хаатычным запаўненні бланка адказаў магчымасць атрымаць тэставы бал, які б гарантаваў абітурыенту залічэнне ва ўніверсітэт, вельмі мізэрная. Адпаведныя разлікі і аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання пераконваюць, што нават слаба падрыхтаваныя абітурыенты спрабуюць выконваць заданні, а не выбіраюць мудрагелістыя схемы запаўнення бланкаў.

Хачу дадаць, што заданні з выбарам адказу з ліку некалькіх прапанаваных варыянтаў выкарыстоўваюцца ва ўсіх краінах, дзе экзамены праводзяцца ў тэставай форме. Многія краіны, каб максімальна аўтаматызаваць працэс апрацоўкі тэставых матэрыялаў, прапануюць на экзамены заданні толькі з выбарам варыянту адказаў. Напрыклад, Лонданская школа эканомікі і палітычных навук на ўступных экзаменах па матэматыцы прапануе на працягу адной гадзіны выканаць 30 заданняў з множным выбарам. У нашых калег ва Украіне пры знешнім незалежным ацэньванні (аналаг ЦТ) усе тэсты камбінаваныя: па большасці прадметаў 90% заданняў на выбар варыянтаў адказаў (частка А) і толькі 10% — адкрытага тыпу (частка В).

Мы таксама аналізавалі, як спраўляюцца абітурыенты з вобласцю А і В, і пераканаліся, што карэляцыя іх паспяховасці ў рабоце над адкрытымі і закрытымі заданнямі вельмі высокая. Дарэчы, у Расіі, дзе на Адзіным дзяржаўным экзамене выкарыстоўваюцца яшчэ і заданні вобласці С (з разгорнутым варыянтам адказу), канстатуюць, што да іх прыступае ўсяго 10-15 працэнтаў ад агульнай колькасці абітурыентаў. Таму мы адмаўляцца ад адкрытых заданняў з варыянтамі адказаў не збіраемся...

**Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.**

**БУДЗЬ У КУРСЕ!**

**За нецэнзурныя словы або за розныя іншыя надпісы, якія не маюць дачынення да зместу тэста і якія абітурыенты пакідаюць у бланках ЦТ, цяпер караюць. Фактычна гэта азначае адхіленне ад далейшага ўдзелу ў прыёмнай кампаніі — сертыфікаты такім абітурыентам не выдаюцца. Гэты пункт увайшоў у «Палажэнне аб арганізацыі і правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання».**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## «АЎТОБУС ВЫЗВАЛЕННЯ»

**У Полацкім раёне ў гонар 70-й гадавіны вызвалення Беларусі будуць курсіраваць «Аўтобусы вызвалення».**

— 2 і 3 ліпеня будзе праведзена раённая патрыятычная акцыя «Аўтобус вызвалення». 14 святочна ўпрыгожаных аўтобусаў даставяць удзельнікаў акцыі больш чым да 110 помнікаў, абеліскаў, памятных знакаў, брацкіх магіл. Пасажыры аддадуць даніну памяці палеглым у жорсткія ваенныя гады, тым, хто здзейсніў подзвіг у імя Радзімы.

Пасажырамі «Аўтобусаў вызвалення» стануць ветэраны, прадстаўнікі мясцовай улады, БРСМ, піянерскай арганізацыі і іншыя. Яны наведаюць звыш 90 населеных пунктаў і 7 урочышчаў, ускладуць вянкі і кветкі да месцаў баявой славы, павіншуюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны са святам. 3 ліпеня ўсе аўтобусы праедуць па цэнтральных вуліцах Полацка, — паведаміла нам **Валянціна УЛАСЕНКА, галоўны спецыяліст аддзела па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі Полацкага райвыканкама.**

Сёння на тэрыторыі сельсаветаў Полацкага раёна пражывае больш за 40 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, каля 170 былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У ГОНАР ЛЁТЧЫКАЎ

**Яшчэ тры прозвішчы, якія заставаліся невядомымі з часоў вайны, вернуты з небыцця.**

Яны нанесены на гранітны помнік, усталяваны непадалёку ад магілёўскай вёскі Макарынцы. Менавіта тут абарваўся жыццёвы шлях трох членаў экіпажу баявога самалёта ПЕ-2, які пацярпеў крушэнне ў чэрвені 44-га. Абломкі яго былі падняты мінулай восенню пошукавікамі магілёўскага атрада ВІККРУ разам з 52-ім асобным пошукавым батальёнам. Па нумары самалёта было вызначана, што баявое заданне выконвалі Усман Ахмадулін з Казані, Уладзімір Паўлоўскі з Чкалаўскай вобласці і Васіль Марусенка з Краснаярскага краю — на той момант ім было ўсяго па 22-24 гады.

Аддаць даніну памяці прыйшлі прадстаўнікі мясцовай улады, працоўных калектываў, ветэраны, моладзь. Адбыўся невялікі мітынг, падчас якога да помніка былі ўскладзены вянкі і кветкі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## МАСТЫ НА РАМОНТ, РУХУ НЯМА

**На ўчастку Орша — Талачын запланаваны рамонт чыгуначных мастоў.**

У гэтай сувязі, як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, з раніцы 25 чэрвеня да апоўдня 26 чэрвеня руху цягнікоў ад станцый Мінск-Пасажырскі, Мінск-Усходні, прыпыначнага пункта Інстытут культуры да станцыі Орша-Цэнтральная не будзе. Цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа адпраўленнем са станцыі Мінск-Усходні і прыпыначнага пункта Інстытут культуры будуць ісці толькі да станцыі Талачын і назад. Перавозкі пасажыраў паміж станцыямі Талачын і Орша-Цэнтральная не будзе.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у даведачных бюро вакзалаў, а таксама на станцыях. А лепш, як раяць чыгуначнікі, ва ўказаныя дні трэба, па магчымасці, устрымацца ад паездак менавіта на цягніках і скарыстацца іншымі відамі транспарту.

## У КРЫМ МОЖНА БУДЗЕ ПАЕХАЦЬ ДА ПАЧАТКУ ВОСЕНІ

**Беларуская чыгунка падоўжыла продаж праязных дакументаў на цягнікі ў зносінах з Крымам да 1 верасня.**

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, гаворка ідзе пра цягнікі №100/99 Мінск — Сімферопаль, №160/159 Мінск — Еўпаторыя, №486/485 Баранавічы — Феадосія.

Нагадваем, што цягнік №100/99 Мінск — Сімферопаль адыходзіць са станцыі Мінск-Пасажырскі штодня ў 7.45 і прыбывае на станцыю Сімферопаль-Пасажырскі на наступны дзень у 13.05. Час адпраўлення цягніка ў зваротным кірунку з Сімферопаля — 19.20, прыбыццё ў Мінск — 23.17 наступнага дня. У састаў цягніка ўключаны беспераcадачныя вагоны Брэст — Сімферопаль, Віцебск — Сімферопаль, Магілёў — Сімферопаль, Гродна — Сімферопаль.

Цягнік №160/159 Мінск — Еўпаторыя курсіруе адзін раз на чатыры дні. З Мінска выходзіць у 20.03 і прыбывае на станцыю Еўпаторыя ў 4.00 праз суткі. Час адпраўлення цягніка ў зваротным накірунку з Еўпаторыі — 9.49, прыбыццё ў Мінск — 15.40 наступнага дня.

Цягнік №486/485 Баранавічы — Феадосія таксама будзе курсіраваць адзін раз на чатыры дні. Адпраўленне са станцыі Баранавічы-Палескія — у 18.07, прыбыццё ў Феадосію — у 5.00 праз суткі. У зваротным кірунку цягнік будзе адыходзіць з Феадосіі ў 9.00 і прыбываць у Баранавічы ў 18.05 наступнага дня.

## «СПЕЦЫЯЛІЗАВАЛІСЯ» НА ВЕЛАСІПЕДАХ

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС сталіцы ўстанавілі асобы грамадзян, якія на працягу доўгага часу займаліся крадзяжамі веласіпедаў.**

Імі аказаліся раней судзімы за крадзеж 38-гадовы мужчына і яго 32-гадовая сяброўка. «Спецыялізавалася» парачка на крадзяжах веласіпедаў з пад'ездаў дамоў. Прычым не спынялі іх і процiўгонныя замкі, якія былі на транспартных сродках, — іх папросту перакусвалі пры дапамозе спецыяльных інструментаў. Як папярэдне мяркуецца, толькі на тэрыторыі Цэнтральнага раёна імі было здзейснена як мінімум пяць крадзяжоў. Зламыснікаў затрымалі з доказамі віны падчас чарговага крадзяжу двух веласіпедаў з пад'езда дома на тэрыторыі ўжо Ленінскага раёна сталіцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 17 (234)

■ Музычнае паветра



# НА КРЫЛАХ КАХАННЯ,
## альбо Развітанне з «Кармэн» прызначана ў Нясвіжы

**У гэтыя дні пяты раз праходзяць «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў». Гэта айчынны праект, калі опера і балет паказваюцца на адкрытым паветры ў Нясвіжы. Што даволі распаўсюджана ў Еўропе. Але жаданне перанесці лепшыя тэатральныя пастаноўкі ў гістарычнае асяроддзе палацавага комплексу надае «Вечарам Вялікага» асаблівы настрой.**

Адпаведна з ім будуецца і праграма. Сёлета яна адразу настройвала на рамантычны лад — канцэртам «Мелодыі кахання» ў выкананні струннага квінтэта «Сэрэнада» і салісткі Таццяны Траццяк (сапрана). Але лірыку змяняюць жарсці, якія зацягваюць у віры пачуццяў герояў оперы «Кармэн» (Жоржа Бізэ). Вось тут у Нясвіжы, дзе таксама калісьці кіпелі жарсці, зусім па-іншаму ўспрымаюцца словы «У любви, как у пташки, крылья…» Галоўныя партыі спявалі Аксана Якушэвіч, Эдуард Мартынюк, Настасся Масквіна і Уладзімір Пятроў. Спектакль да паказу падчас «Вечароў» абралі невыпадкова. Гэта магчымасць яго паглядзець нібы на развітанне: на год ён сыходзіць з афішы тэатра, каб потым вярнуцца ў абноўленым выглядзе і ў новым рэжысёрскім прачытанні.

Але ж гэта Нясвіж — значыць, павінна гучаць і беларуская музыка. Напрыклад, С. Манюшка. Да 195-годдзя творцы Вялікі тэатр падрыхтаваў праграму «З Ойчам адвечным», якая гучыць 21 чэрвеня ў касцёле Божага Цела. Месца абрана невыпадкова: Манюшка доўгі час быў арганістам у касцёле і напісаў шмат духоўнай музыкі, з якой знаёмяцца людзі падчас дабрачыннага канцэрта.

Вечар суботы — час балета. У горадзе, які калісьці бачыў балеты радзівілаўскага тэатра, цяпер фактычна творчая рэвалюцыя. Прычым у развіцці. Праграма «Вечар балета: са стагоддзя XIX у стагоддзе XXI» дазваляе прасачыць гісторыю харэаграфічнага мастацтва. Развіццё балета ад класічнага танца да бессюжэтнага ў балеце «Сэрэнада» (аўтар Джордж Баланчын) і нават постмадэрнісцкіх «Шасці танцаў» (харэограф Іржы Кіліян), якія цяпер ёсць у афішы тэатра.

Шмат чаго ёсць цікавага, што дазваляе паглядзець інакш на гісторыю мастацтваў і месца асоб у ёй. Вось хоць бы асоба Антоніа Сальеры. Імя, якое доўгі час (пасля з'яўлення «Маленькіх трагедый» А. Пушкіна) гучала выключна ў адмоўным кантэксце, патрабуе рэабілітацыі! І ў нас ёсць магчымасць змяніць у свядомасці акцэнты, зразумець, што да смерці геніяльнага кампазітара Моцарта Сальеры не мае ніякага дачынення. Ну не трэба гэта было музыканту і кампазітару, які карыстаўся вялікай павагай, меў аўтарытэт і мог жыць так, каб нікому не зайздросціць. У гэтым можа пераканаць яго творчасць. Нам прапануюць у нядзелю паслухаць на вольным паветры камерную оперу Сальеры «Спачатку музыка, потым словы», якая раскрывае адваротны бок тэатральнага жыцця.

Якое яно сёння? Няпростае, напэўна, але мы — гледачы — павінны ведаць толькі той бок, які нас радуе і натхняе. Той бок, дзе ёсць асобы, прыгожыя галасы і цудоўныя мелодыі з опер. Калі ласка: гала-канцэрт «зорак» Вялікага тэатра Беларусі. А яны ў нас ёсць!

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Імпрэза

# Голас Янкі Купалы прагучыць у спектаклі

**Дзяржаўны тэатр беларускай драматургіі вырашыў аб'яднаць народнае свята Купалле з іменем паэта Янкі Купалы, 130-годдзе якога мы адзначалі два гады таму. Таму на 7 ліпеня рыхтуюць цікавую імпрэзу, якая будзе складацца з некалькіх частак.**

Напачатку у тэатры будзе паказаны спектакль у жанры дакументальнай алегорыі «Купала. Кругі раю», прэм'ера якога адбылася ў 2012 годзе. Яго аўтар і рэжысёр Святлана Навуменка асабліва падкрэслівае той факт, што ўвесь тэкст пастаноўкі заснаваны на дакументах і не мае ніводнага слова «адсябяціны».

«Мы прынцыпова пастараліся нічога не дадумваць. Гэта не спроба лірычнага асваення творчасці Купалы, але спроба зразумець, што з ім адбылося ў той крывавы, цяжкі час, у які ён жыў, — дзеліцца рэжысёр.

Для стварэння спектакля аўтар вывучала пратаколы допытаў, лісты, лісты з-за мяжы, выказванні людзей, якія жылі разам з Янкам Купалам. У пастаноўцы разыграна паэма «Бандароўна», шэсць вершаў паэта ляглі ў аснову песень — яны прагучаць у тэатралізаванай дзеі. Больш за тое, у спектаклі можна пачуць нават голас Янкі Купалы — яго знайшлі ў радыёархівах. Выканаўцам галоўнай ролі з'яўляецца Дзяніс Паршын, які гаворыць, што знайшоў ключ да ролі вялікага паэта праз пошук паэта ў сабе.

ДТБД у гэты дзень зможа прыцягнуць і аматараў тэатральнага мастацтва і тых, каго цікавіць тэма нацыянальнай спадчыны. Пасля спектакля адбудзецца тэатралізаваная дзея з запальваннем купальскага вогнішча, пошук папараць-кветкі, народныя песні ў выкананні народнай артысткі Беларусі Таццяны Мархель і фальклорнага гурта Белдзяржфілармоніі «Купалінка».

Наведвальнікі тэатра змогуць таксама азнаёміцца з выставай, якую тэатр беларускай драматургіі стварае разам з Дзяржаўным літаратурным музеем імя Янкі Купалы і Дзяржаўным музеем гісторыі тэатральнай і музычнай культуры. Музеі прадставілі ўнікальныя экспанаты. У выставе таксама ўдзельнічаюць маладыя беларускія мастакі.

«Наш тэатр маленькі, але горды, тэатр еўрапейскага фармату. Дзякуючы гэтай імпрэзе мы зможам зацікавіць людзей, якія любяць тэатральнае мастацтва і не толькі», — гаворыць дырэктар тэатра Уладзімір Карачэўскі.

Разам з тым, можна ўзгадаць, што 16–17 ліпеня ў Дзяржаўным тэатры беларускай драматургіі адбудзецца прэм'ера спектакля Святланы Навуменка «Фінт-Круазэ», які аб'ядноўвае дзве гарадскія камедыі.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

■ Дзеля памяці

# «ГОНАР НЕ МІНАЕ»

## ГЭТЫМІ СЛОВАМІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА МОЖНА ВЫЗНАЧЫЦЬ АСОБУ ПІСЬМЕННІКА ВАСІЛЯ БЫКАВА. ЯНЫ І ПРАГУЧАЛІ НА АДКРЫЦЦІ МУЗЕЯ-ДАЧЫ ПІСЬМЕННІКА Ў ДЗЕНЬ ЯГО 90-ГОДДЗЯ

Дачны пасёлак каля Ждановічаў, што пад Мінскам. Маляўнічыя мясціны — і не скажаш, што горад блізка. Дарога збочыла і прывяла да цаглянага будынка з новай шыльдачкай. Ён выглядвае з-за дрэўцаў — сціпла, ветліва, але зусім ненавязліва запрашае спыніцца. Спыніцца хочацца: сесці каля дрэў і паслухаць іх шэпт, а потым па акуратненькіх прыступках зайсці ў дзверы. Паклікаць гаспадароў…

Гаспадары — сям'я Быкавых. Так і застаюцца, па сутнасці, нягледзячы на тое, што пасля смерці пісьменніка ўдава Васіля Уладзіміравіча Быкава Ірына Міхайлаўна вырашыла аддаць сямейнае лецішча пад музей — дзяржаўны.



І гэта сапраўды ў дзяржаўных інтарэсах, як падкрэсліў на адкрыцці **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ:**

— Сёлета год 90-годдзя Васіля Быкава, пісьменніка, які здабываў Перамогу на франтах вайны. І я хацеў бы нагадаць лічбу 70-годдзя вызвалення Беларусі. Калі вы супаставіце гэтыя дзве лічбы, то можна ўявіць, колькі гадоў было Васілю Уладзіміравічу на пачатку вайны. У яго за плячыма было некалькі гадоў навучання на скульптара, але гэтага не адбылося: перашкодзіла вайна. Аднак ён назаўсёды застаўся мастаком, які ляпіў, ствараў чалавечыя вобразы, чалавечыя душы. Было пахаванне, калі пад Кіраваградам Быкава памылкова запісалі як загінулага, а яго матуля атрымала ліст, у адпаведнасці з якім даводзілася, што яе сына больш няма. Вось яно: «Пайсці і не вярнуцца…» Але ж Васіль Уладзіміравіч Быкаў не толькі прайшоў гэтую вайну, але ён вярнуўся, каб кожнаму з нас расказваць пра жудасныя моманты, гадзіны, месяцы, гады такой страшэннай з'явы, як вайна. У кожнага свой Быкаў, у кожнага ёсць свой музей Быкава — гэта яго кнігі, якія ставяць на паліцу, і мы іх час ад часу перагортваем, звяртаемся да яго вобразаў. Для мяне гэта мастак, які пісаў толькі двума колерамі — чорным і белым. Іншага няма, таму што расказваць пра тое, як адбывалася барацьба паміж анёламі і дэманамі, — можна толькі дзвюма фарбамі.

Праўда, у яго пасляваенным жыцці было месца розным колерам. Але гэта тое, што тычыцца цёплых пачуццяў, сяброў, таго, што душы было радасна. І вось на дачы «быкаўскі» свет нібыта падсвечваецца знутры тымі прадметамі, якімі ён карыстаўся, з дапамогай якіх рабіў свой дамок утульным. Канапка, крэслы — распаўсюджаныя ў савецкі час мадэлі. Нічога асаблівага, пры тым, што гэты чалавек — Велічыня. У кабінеціку — пішучая машынка, аркушы з тэкстамі і праўкамі. Акенца, якое так і запрашае: «Ну глянь жа, якая прыгажосць, радуйся!..» І радаваўся: маляваў, што бачыў і адчуваў тут. Вось і фарбы напагатове — у асобным пакойчыку адчуваецца Быкаў-мастак. Ён, між іншым, адчуваецца нават у кухні: на сцяне над кафляй савецкага ўзору ён намаляваў вельмі радасны нацюрморт з садавіны і гароднiны. Настрой на дачы для гаспадара быў вельмі важны: столькі гасцей прыходзілася прымаць.

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Мікалай ЧАРГІНЕЦ** узгадаў:

— Калі Васілю Уладзіміравічу выдзелілі ўчастак, то гэтае месца мы асвятлялі сваёй прысутнасцю, і нават «чаркай кавы». Тут недалёка была дача Андрэя Макаёнка, што дазваляла не так часта, але сустракацца немалым колам пісьменнікаў, пагаварыць, пасядзець, падзяліцца планамі. Ён быў вельмі ўважлівы, падтрымліваў маладых пісьменнікаў. Мне ён пісаў лісты ў Афганістан, падтрымліваў разам з Ірынай Міхайлаўнай, распавядаў пра справы, каб адцягнуць увагу ад таго, што адбываецца навокал, жадаў вярнуцца жывым. Для мяне Васіль Уладзіміравіч не проста вялікі пісьменнік. І як бы ні ўспрымалі яго творы нават у той час, але і крытык адмоўны, і крытык станоўчы ўсё-такі сыходзіліся на тым, што ў нашай дзяржаве з'явіўся вялікі пісьменнік, які піша праўду. Праўда падабаецца пэўным людзям. Але Васіль Уладзіміравіч пры ўсіх крытычных наскоках на сябе як на чалавека ўсё-такі быў ацэнены дзяржавай: дэпутат Вярхоўнага Савета і СССР, і БССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Ён быў прызнаны нават тымі людзьмі, якім не падабалася яго шчырасць меркаванняў па тых ці іншых пытаннях, у тым ліку міжнароднага значэння. Тут на душы адразу ўсплывае, што гэты вялікі чалавек сышоў рана. Ён абапіраўся на Ірыну Міхайлаўну, якая яму вельмі дапамагала. Трэба падзякаваць Ірыне Міхайлаўне за вялікі крок: што яна прапанавала для музея гэты дом, які пабудавалі яны сваімі рукамі з Васілём Уладзіміравічам. Але мы выйшлі з прапановай, каб музеі Быкава былі ў Віцебску, Гродне.

Сапраўды, ёсць «Быкаўскія мясціны». Але, акрамя канкрэтных кропак, дзе ён жыў, «Быкаўскімі мясцінамі» можна назваць усю Беларусь. Даследчык творчасці Васіля Быкава літаратуразнаўца Міхась Тычына адзначыў, што талент — гэта нараджэнне прыроды, а беларуская зямля вельмі шчодрая ў гэтым сэнсе. Максім Танк выказаўся, што тут сама зямля спявае. Але калі мы вымаўляем слова «геній», то дадаём ад сябе — геній ад Бога. Васіль Быкаў быў аднолькава таленавіты ў розных сферах: выдатны мастак слова, мастак па жыцці — увесь час маляваў, дзе б ні быў: падчас застолля ці ў прэзідыуме… Малюнкаў многа, і дагэтуль не ўдалося ўсе сабраць, але частка, якая знайшла месца на лецішчы, дазваляе ўдакладніць сваё адчуванне асаблівасцяў яго літаратурнай творчасці. І наогул адчуванне гэтага чалавека — якім жа ён быў у жыцці.

Вось адзін эпізод. Шмат хто казаў пра Быкава, якім выдатным аўтамабілістам ён быў (вось жа і гараж на дачы нездарма ёсць). Аднойчы яны ехалі з Алесем Адамовічам, імчаліся непадалёк ад Масквы, і па той жа дарозе з адваротнага боку — сустрэчныя машыны, і ўвесь час нехта з кіроўцаў здзіўлена паказваў рукамі: «Куды ты едзеш?» Аказалася, што Быкаў ехаў насуперак усім па дарозе з аднабаковым рухам. Адамовіч тут жа зрабіў выснову: «А Быкаў — такі, ён заўсёды ехаў насустрач плыні». Таму ён і вялікі. Сапраўды геній, які выконваў сваю місію на зямлі. З глыбокім пачуццём уласнай годнасці, ён гаварыў і пісаў аб тым, што бачыў, што перажываў і што яго хвалявала.

Але вібрацыя хвалявання, хоць і нябачная, але надзвычай уплывовая. Тое, што хвалявала Быкава, стала хваляваць іншых, і нават у блізкім і далёкім свеце. Быкава чыталі ва ўсім Савецкім Саюзе. Яго чытаюць цяпер, ставяць ужо сучасныя фільмы паводле яго твораў — нездарма ж! З павагай да пісьменніка беларусы Санкт-Пецярбурга Аляксандр Станкевіч і Віталь Ляшкевіч перадалі ў новы музей падарунак — партрэт, які быў напісаны ў 1993 годзе пецярбургскім мастаком Сяргеем Ткачэнкам.

Дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Макарэвіч падкрэсліла: «Для культуры патрэбны аўтарытэты… Музей — гэта цаглінка ў памяць». І нагадала словы самога Васіля Уладзіміравіча, якія сёння вельмі дарэчы: «Памяць — гэта матэрыяльная сіла, галоўны элемент чалавечай духоўнасці. Яна не толькі здольная ўзнаўляць мінулае, але і вызначаць будучае».

**Ларыса ЦІМОШЫК**



**Працоўны стол — на ім усё, як пры Быкаве.**



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

**Фарбы — імі пісьменнік маляваў радасць.**



**Кухня — на сцяне малюнкі Быкава.**



**Пакой — месца для сяброў і калег.**

# ПІСАЦЬ ПА-ФРАНЦУЗСКУ МОЖНА… МАСЦІХІНАМ

**Родны горад мае вялікі ўплыў на сваіх жыхароў. Ён можа прытуліць, натхніць… Мастачку Людмілу Аніскавец Нясвіж зачараваў ужо даўно. Сваю любоў да роднага горада яна выражае праз карціны.**



## ВЯРТАННЕ ДА ПЭНДЗЛЯ

Пасля вучобы ў Віцебскім тэхналагічным інстытуце лёгкай прамысловасці Людміла атрымала дыплом мастака-тэхнолага і больш за 20 гадоў працавала настаўніцай. Вучыла дзяцей і маляванню, і чарчэнню, і дамаводству:

— У школе мы больш надавалі ўвагі творчым праектам: пляценню з саломкі, аплікацыі, пэчварку… Шылі беларускіх лялек. У школьнай праграме гадзіны ўрокаў па мастацтве звялі да мінімуму, і гэта не на карысць эстэтычнага развіцця маладога пакалення. Дзеці ідуць дадаткова займацца на факультатывы, на гурткі, у школы мастацтваў.

Навучэнцы Людмілы заўсёды займалі прызавыя дыпломы на школьных, раённых конкурсах. Ды і сама настаўніца не адставала: штогод прымала ўдзел у выставах на настаўніцкіх канферэнцыях.

— Гадоў 7 таму, пасля нараджэння другога дзіцяці, прачнулася жаданне ізноў маляваць, — успамінае Людміла. — Брат дапамог разабрацца з фоташопам. Мне спадабалася перапрацоўваць здымкі гарадскіх пейзажаў у графічныя малюнкі. Потым узялася за гелевую ручку, рабіла розныя ілюстрацыі. Вярнуцца да пэндзля натхніла просьба ксяндза Францішка аднавіць перад Калядамі шопку (калядная традыцыя ўпрыгожваць касцёл фігуркамі святых) Нясвіжскага касцёла.

Мастачку заўсёды вабіла творчасць імпрэсіяністаў:

— Гэты кірунак у мастацтве падабаўся мне яшчэ са студэнцтва. Асабліва працы Эдуарда Манэ, Клода Манэ, Эдуарда Картэса, Канстанціна Каровіна… Уражвае свежасць і непасрэднасць іх успрымання наваколля і тое, як імпрэсіяністы ўдала адлюстроўвалі імгненныя ўражанні. Мяне захапляе гульня колераў на халсце. Але я выбрала для працы не пэндзаль, а масціхін (металічная лапатка з выгнутай ручкай. — **Аўт.**). Пэўныя навыкі ўспомніліся з інстытута. Але саму тэхніку засвоіла праз інтэрнэт.

## НЯСВІЖ ВЕЛЬМІ ПАДОБНЫ НА ПАРЫЖ

Карціны Людмілы Аніскавец (у асноўным пейзажы і нацюрморты) надоўга застаюцца ў памяці. Масціхін дазваляе выказаць усю моц гучання колераў. Маленькая металічная лапатка ў руках мастачкі стварае прыгожую і складаную фактуру фарбы на паверхні карціны. Прыходзіш дадому — ізноў перад табой пяшчотныя пялёсткі ружы, аб'емныя кроны асенніх дрэў…

***— Людміла, вашы нясвіжскія пейзажы нагадваюць Францыю…***

— Вы маеце рацыю. Назвы гарадоў Нясвіж і Парыж сугучныя. І паколькі я прыхільніца імпрэсіянізму, які з'явіўся ў Францыі, то з'явілася жаданне маляваць Нясвіж на французскі лад. Некаторыя турысты сапраўды шчыра здзіўляліся, што я ніколі не была ў Парыжы, а пішу так па-французску. За аснову любой сваёй карціны я бяру нясвіжскія пейзажы: від на ратушу, Фарны касцёл, замак Радзівілаў, а «французскасці» надаюць дэталі. Масціхін дае вялікія магчымасці для імправізацыі падчас творчай працы…

Маляваць на продаж Людміла Аніскавец пачала 4 гады таму. Асноўным пунктам стаў Нясвіжскі салон-галерэя «Скарбніца», дзе жанчына выставіла свае працы.

— Першым сур'ёзным пакупніком стаў вядомы джазавы музыкант Яўген Уладзіміраў. Спачатку ён набыў маю карціну ў «Скарбніцы», а пасля стаў пастаянным кліентам.

Напісаць карціну масціхінам — працэс даволі працяглы. Адна работа можа высыхаць да чатырох месяцаў! Таму да справы Людміла падключыла бацьку, які ўжо трэці сезон прадае карціны на ўваходзе ў парк, пакуль мастачка піша новыя.

Пра прыхільнікаў сваёй творчасці Людміла расказвае з асаблівым настроем:

— Пасля таго, як прысвяціла свой час любімай справе, маляванню, маё жыццё стала больш цікавым. Я пазнаёмілася з вялікай колькасцю людзей: ад творчых натур да сур'ёзных бізнесменаў. Сярод іх ёсць такія цікавыя людзі! І прафесары, і захопленыя старажытнымі цывілізацыямі вандроўнікі. З некаторымі падтрымліваем сувязь праз сацыяльныя сеткі.

## «У НАС НЕ РАЗВІТА ПАВАГА ДА МАСТАЦТВА…»

Інтэрнэт дазваляе мастачцы таксама паказаць сваю творчасць большаму колу людзей. Цяпер Людміла працуе над стварэннем свайго сайта art-nes.com. Яшчэ яе карціны можна паглядзець у галерэі на artminsk.by.

— Я магу ганарыцца тым, што мае карціны прадаваліся ў Польшчу, Ізраіль, Італію, ЗША і нават у Аўстралію. Серыю карцін з выявамі замка Радзівілаў заказвала Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, калі Нясвіж быў культурнай сталіцай Беларусі.

***— Ці набываюць вашы карціны самі несвіжане?***

— Часцей купляюць расіяне. Сярод карэнных жыхароў пакупнікоў, на жаль, няшмат. Але ў іх ёсць магчымасць хоць кожны дзень гуляць па Нясвіжы і любавацца ім *(усміхаецца)*. Можа, таму і не бачаць сэнсу, каб набываць карціны з відам горада. Але ёсць і кліенты-несвіжане. Яны купляюць у асноўным для падарункаў. На жаль, людзі ахвотней купяць ва ўнівермагу стандартную карціну з выявай букета кветак ці ката, чым аддадуць перавагу эксклюзіву… У нас наогул не так развіта павага да мастацтва. Нядаўна я наведала Вільню і была вельмі здзіўлена! У Літве самая дарагая адукацыя — мастацкая і музычная. Там прэстыжна займацца мастацтвам.

**Вераніка ЦВІРКО.**





■ Увага: віктарына!

# «ЗВЯЗДА» ЯК ПАДРУЧНІК

**Сёлета Беларусь адзначае 70-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтая дата адметная і для «Звязды» — газеты-падпольшчыцы, газеты-партызанкі, якая прайшла праз ваеннае ліхалецце разам са сваімі чытачамі.**

**Напярэдадні свята прапануем вам, шаноўныя чытачы, узгадаць некаторыя падзеі і факты з гісторыі газеты — а па вялікім рахунку, і роднай краіны. Самыя памятлівыя, уважлівыя і дасведчаныя ўдзельнікі кожнага тура рэдакцыйнай віктарыны будуць адзначаны прызамі ад рэдакцыі. Сёння, дарэчы, стартуе першы тур, а ўсяго іх будзе некалькі. Падвядзенне ж вынікаў віктарыны плануецца ў жніўні, напярэдадні дня нараджэння «Звязды». Адказы на пытанні першага тура з пазнакай «Віктарына» прымаюцца на паштовы (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А) і электронны адрас (info@zvyazda.minsk.by) рэдакцыі па 26 чэрвеня.**

## «Гісторыя газеты — гісторыя краіны»

**1 На якой сталічнай вуліцы ўсталяваны помнік «Звяздзе»?**
— праспект Незалежнасці
— вуліца Кульман
— вуліца Багдановіча
— праспект газеты «Звязда»

**2 Як звалі жанчыну, у хаце якой друкавалася падпольная «Звязда»?**
— Альбіна
— Марфа
— Галіна
— Марыя

**3 У якім годзе быў адкрыты мемарыял «Востраў Зыслаў» на месцы, дзе падчас Вялікай Айчыннай вайны амаль 1,5 года знаходзіўся падпольны абкам партыі, партызанскі аэрадром і друкарня некалькіх газет?**
— 1950 г.
— 2001 г.
— 1969 г.
— 1984 г.

**4 Дзе і калі падчас Вялікай Айчыннай вайны ўбачыў свет апошні нумар «легальнай» «Звязды»?**
— 21 чэрвеня 1941 г. у Мінску
— 3 студзеня 1942 г. у Магілёве
— 13 жніўня 1941 г. у Гомелі

**5 Адзін з гэтых людзей не з'яўляўся рэдактарам «Звязды» падчас Вялікай Айчыннай вайны. Хто?**
— Мікалай Дзялец
— Уладзімір Амельянюк
— Міхаіл Барашкаў
— Ядзвіга Савіцкая
— Вячаслаў Нікіфараў

**6 Дзе і калі быў надрукаваны першы нумар падпольнай «Звязды»?**
— 23 ліпеня 1942 г. у Любанскім раёне
— 30 снежня 1941 г. у Мінску
— 18 мая 1942 г. у Мінску
— 23 лютага 1942 г. у Маскве

**7 Таму, хто ўкажа, дзе друкуецца «Звязда», фашысцкія акупацыйныя ўлады абвясцілі ўзнагароду...**
— 300 рублёў
— 20 тысяч марак і карову
— 10 тысяч марак
— 75 тысяч марак

**8 Якія дзяржаўныя ўзнагароды мае «Звязда»?**
— Ордэн Леніна
— Ордэн Чырвонай Зоркі
— Ордэн Айчыннай вайны 2 ступені і ордэн Багдана Хмяльніцкага
— Ордэн Айчыннай вайны І ступені і ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга

**9 Іменем першага рэдактара падпольнай «Звязды» Уладзіміра Амельянюка не толькі названы вуліцы ў Мінску і родным пасёлку Дно Пскоўскай вобласці — яго вобраз увекавечаны ў кіно. Як называецца гэты фільм?**
— «Дзяўчынка шукае бацьку»
— «Руіны страляюць»
— «Рэпартаж з лініі агню»
— «Балада пра салдата»

**10 Як вы мяркуеце, што за канструкцыя на здымку?**



■ Роздум пісьменніка

# ПЛАСТМАСА



Днямі мяне «закляніла». З-за смецця, якое пачалі ўжо кідаць і на вуліцах. А больш дакладна — пластмасы. Але пачну здалёк.

Гадоў дваццаць таму па журналісцкіх справах я праязджаў праз адну нашу вёску. Не буду называць яе, бо не ведаю, як яна цяпер. На маіх вачах там адбываўся самасуд. Судзілі праезджага вадзіцеля (побач — шаша), які збочыў да мясцовай сажалкі і выкінуў туды нейкае смецце. Увязненага прымусілі вылавіць смецце з вады і пасля ў выхаваўчых мэтах, па парадзе вясковых старэйшын, надавалі яму ў пысу і добрых выспяткаў.

— У нас таму і парадак, — давялі мясцовыя, — што мы самі за ім сочым. І нікому не дазволім быць быдлам.

У вялікай дагледжанай сажалцы боўтала рыба, смела праплыла непалоханая выдра. «Самі азярцо выкапалі, — патлумачылі мне. — Прыстойнаму чалавеку і палавіць дазволім — тут карасі па кілаграме на гачок лезуць. Мы не жлабы».

Нобелеўскі лаўрэат па літаратуры Іва Андрыч любіў масты і шмат апісваў іх у сваіх творах. Часта наведваючы Барысаў, у межах якога працякаюць тры рэчкі і існуюць аж пяць мастоў, я ўспамінаю замілаванне вялікага баснійца перад рэкамі і мастамі. Аўтамабільны мост цераз знакамітую Бярэзіну сімвалічна дзеліць горад на стары і новы. Побач з асноўнай дзяржаўнай магістраллю, літаральна за год, тут адбудаваны тры супермаркеты, раней вырас мікрараён. З моста відаць і яшчэ адно дзіва — вялізны, у некалькі квадратных кіламетраў, вадаём.

Здалёк усё прыгожа — дрэвы, водная роўнядзь, вузкая паласа малой ракі Сха, якая праз гэты вадаём, які тут называюць Земснарад, упадае ў Бярэзіну. Чвэрць стагоддзя таму тут пачалі будаваць зону адпачынку: размылі і паглыбілі пойму Схі. Але надышлі «хвацкія 1990-я», жалезныя баржы ўтапілі, будаўнікі зніклі. Нягледзячы на ўсё гэта, Земснарад застаўся. Назіраць за яго лёсам цяпер ужо небяспечна для нервовай сістэмы. Таксама, як і за лёсам дзвюх рэчак, якія павінны толькі ўпрыгожваць горад. У якім, дарэчы, горадзе (лічы, у яго цэнтры) можна ўбачыць такое жыватворнае спалучэнне? Вадаём і дзве ракі?

Але...

Берагам Схі, зарослай вербалозам, бруднай, гібеючай, іду да Земснарада. Бачу бясконцыя груды пластыкавых бутэлек, скарыстаных разавых талерак і відэльцаў, пакеты, зноў пакеты, упакоўкі з-пад яек і ёгуртаў, пластыкавыя шклянкі, сляды ад вогнішчаў і зноў бутэлькі — пластыкавыя і шкляныя. Апошнія дзе здолелі — білі на асколкі, а калі не маглі, а так карцела, то, пэўна, у істэрыцы лупілі іх аб зямлю. Інакш адпачынак — не ў радасць.

Шмат дрэў звалілася ў раку. Там, дзе яны ствараюць затор, своеасаблівую гаць, — горы бруднага, зацвілага пластыку: пакеты, бутэлькі. Гэта тое, што мы бачым зверху. Пра тое, што на дне, лепш не думаць. Яшчэ горшая, лічы, жудасная карціна на берагах Земснарада. Тут бясконцыя сляды баляванняў — усё той жа пластык, аб'едкі, недакуркі, пачкі ад цыгарэт, фольга, старыя чаравікі, зношаныя майкі, скарыстаныя шпрыцы, пакеты... Увесь гэты набор у вадзе ля берага і далей. У цёплыя дні (пад'езд да вадаёма чамусьці не забаронены) тут чароды машын, многія вязуць ужо з сабой водныя скутары. А на вадаёме — сапраўдная вакханалія: маторкі, скутары, плывучы рэстаранчык — усё гэта раве, брыдкасловіць, кідае ў ваду адходы.

Тое ж на берагах Бярэзіны. Плывуць адна за адной пластыкавыя бутэлькі, смецце. Смецце ляціць у рэкі з мастоў. Асабліва жудасна глядзець на гэта ўзімку: на лёдзе — горы адходаў спажывання.

У чалавека ў генах, пэўна, закладзена жаданне адпачыць душой і целам менавіта ля вады, на беразе ракі, возера і г.д. Калі ж ён зноў і зноў пакідае тут пасля сябе звалку і зноў жа п'е, гікае і спявае тут у чарговы адпачынак — дык ці чалавек ён? А можа — скот?

Можа, за часы камуністычнай утопіі, бязмернага п'янства, жыцця па хлусні, замбіравання тэлебачаннем чалавек канчаткова дэградаваў? Можа, пачалася яго інвалюцыя і ён праз нейкі час ператворыцца ў малпу?

Больш як стагоддзе таму бельгійскі хімік Леа Хендрык Бэкеланд у сваім гаражы ў Нью-Ёрку (ён жыў у Амерыцы) атрымаў першую, поўнасцю сінтэтычную пластмасу. У 1922 г. нямецкі хімік Герман Штаўдынгер (нобелеўскі лаўрэат 1953 г.) вызначыў малекулярную структуру пластмасы. Неўзабаве пачалася вытворчасць сілікону. І пайшло: з'явіліся акрыл, паралон, паліфен, поліўрэтан і г.д.

Пластмаса практычна не раскладаецца. Нават тонкі харчовы пакет — за 400 гадоў. Паліць? Атрымаем так званыя дыяксіны — для чалавека гэта смяротная небяспека.

У самым канцы мінулага стагоддзя была вынайдзена «Вялікая Пластыкавая Юшка». Амерыканскі яхтсмен Чарлз Мур на катамаране «Алкаліта» плыў праз Ціхі акіян у маладаследаваным яго раёне. Цэлы тыдзень на яго вачах плавалі кавалкі пластыку, зубныя шчоткі, бутэлькі, пакеты і г.д. Капітан Мур жахнуўся. Праз два гады ён (думкі не давалі спакою) вярнуўся і зрабіў сенсацыйнае адкрыццё. На глыбіні 10 метраў была суцэльная пластыкавая юшка. На кожны квадратны кіламетр да 100 тысяч пластыкавых фрагментаў! Да праблемы падключыліся «грынпісаўцы». Вір, у якім пластыку ў 100 разоў больш, чым у сярэднім аказаўся большы за тэрыторыю ЗША! А дно акіяна? Там збіраецца да 70% марскога пластыкавага смецця. Уся «юшка» «важыць», па падліках вучоных, больш як 120 мільёнаў тон. А гэта — самае страшнае забруджванне, якое зведала планета.

Футуролагі-аптымісты лічаць, напрыклад, што працягласць жыцця любой разумнай цывілізацыі — каля 3 тысяч гадоў, адлічваючы ад пачатку работы першага радыёперадатчыка. Песімісты, такія, як французскі акіянолаг Ж. Кусто, — нашмат менш. Па яго прагнозах, чалавецтва можа пачаць марудна альбо імкліва гінуць ужо дзесьці ў 2050 годзе.

Усе рэкі цякуць у моры і акіяны. Усе яны таксама нясуць туды пластмасу. Асабліва шмат смеццевых адходаў сплывае з афрыканскага кантынента. І не толькі вувузел...

Але ж вернемся да нашых мясцовых балючых пытанняў, да нашых лясоў, рэк і азёраў — бо менавіта тут наша багацце, якому няма цаны.

Іду праз пешаходны масток цераз Бярэзіну. Тут штодня віруе моладзь. На парэнчах панавешаны замкнёныя замкі і замочкі — маладажоны кідаюць ключы ад іх у ваду — на шчасце. А вечарам туды ж ляцяць пластыкавыя пакеты і бутэлькі ад піва. Унізе, на бетонным падмурку — выява ўльтраправых і іх заклік: «Не кідайце смецця». І далей: «Прырода, Радзіма, Народ». На жаль, гэта, як кажуць, адзінокія галасы ў пустэчы. Угаворы і заклікі не дапамагаюць.

Два аўтамабільныя масты цераз раку Сха ў яшчэ горшым стане, бо ўнізе ўсё тое ж пластыкавае смецце, а рэчышча загароджана паваленымі дрэвамі і ўсялякім брудам. А яшчэ сорак гадоў таму тут сплаўлялі лес.

Лічу, надышоў час і ў нас прымаць сур'ёзныя захады. Вызначыцца з заканадаўствам. Бо нават распрацаваная сістэма штрафаў не працуе. У Сінгапуры варта плюнуць на тратуар, а не тое што недакурак кінуць — і атрымай $1000 штрафу. А вось нашы некаторыя параметры: распальванне вогнішчаў у забароненых месцах — 12 базавых велічынь; забруджванне — 20 б.в.; смецце — 2 б.в. і г.д.

Ужо цяпер на тым жа Земснарадзе, куды на глыбіню да 12 м заходзіць рыба, варта, на мой погляд, увесці платную сістэму. З кожнага рыбалова — 1 умоўная адзінка ў дзень. Заплаціў — і сядзі спакойна, лаві сваё шчасце.

За месяц гэта будзе сума прыкладна ў 2 тысячы ўмоўных адзінак. На палавіну яе можна наняць пару чалавек — адміністратара і рабочага, каб збіраць грошы і выдаляць смецце. І штрафаваць бязлітасна, бо толькі скот не разумее таго, што ён творыць, а так, можа, да яго і дойдзе. Будзе і нейкі даход дзяржаве, і, адначасова, ахова прыроды.

А пакуль тут усё па-ранейшаму. Пластыкавы бруд, аб'едкі, маторныя лодкі (дарэчы, адна з іх штогод пад расійскім сцяжком), дзікія п'яныя гіканне і посвіст. А год таму сюды прарвала і гарадскую каналізацыю. Страшна за дзяцей-байдарачнікаў мясцовай спартыўнай школы, якія трэніруюцца на вадаёме, бо бяда (не дай Бог) прыходзіць нечакана.

Дадам, што па самай ажыўленай трасе рэспублікі, якая праходзіць побач, штодня праязджаюць дзясяткі тысяч машын. Сярод іх ёсць і замежнікі. Іншыя з іх спыняюцца альбо збочваюць да вадаёма (уезд жа па-ранейшаму не забаронены), і тут перад іх вачыма і паўстае вышэйапісаная карціна.

Мэрыі, таварыству ахову прыроды (ці існуе яно тут увогуле?), міліцыі трэба ўжо прымаць адпаведныя захады і навесці парадак.

Можна зразумець гарадскія ўлады: у іх іншых клопатаў хапае. Але захаваць твар і адпаведную рэпутацыю рэгіёна — іх прамы абавязак. Дый зазірнём у недалёкую будучыню і будзем шчырымі: абставіны ў сувязі з усё больш частымі прыроднымі і тэхнагеннымі катаклізмамі пагаршаюцца ва ўсім свеце. Наспявае нешта нядобрае. І тое, што нам воляй лёсу дастаўся не самы горшы кавалак зямлі (тысячы азёраў, рэчак і крыніц, лясы, пушчы і запаведнікі), — усё гэта варта берагчы да апошняга, хоць бы для нашых нашчадкаў, — і самай жорсткай, нават іншым разам далёка не папулярнай цаной.

**Юрый СТАНКЕВІЧ**

■ Вяртанне на радзіму

## СПАДЧЫНУ КРАШЭЎСКАГА ПРЭЗЕНТАВАЛІ НА «РУЖАНСКАЙ БРАМЕ»

**Чацвёрты раз у Ружанах адсвяткавалі фэст «Ружанская брама». Былі, як заўсёды, тэатралізаваны паказ, цікавая канцэртная праграма, кірмаш рамеснікаў і народных майстроў, народныя гулянні з гандлёвымі радамі, а таксама традыцыйны ўжо вячэрні феерверк.**

Але яшчэ на першай «Браме» дамовіліся, што фестываль будзе мець абавязковы інтэлектуальны складнік. На гэты раз да свята прымеркавалі выхад электроннай версіі твораў пісьменніка Юзафа Крашэўскага. У многіх крыніцах Юзаф Ігнацы Крашэўскі падаецца, як польскі пісьменнік. Але пружанцы нездарма лічаць яго сваім, бо нарадзіўся вядомы чалавек у мястэчку Доўгае ў сям'і пружанскага харунжага. І правёў тут не толькі сваё маленства, але жыў некаторы час і дарослым. Яшчэ гісторык, грамадскі дзеяч, мастак і кампазітар Крашэўскі праславіўся тым, што напісаў каля 600 тамоў мастацкіх, дакументальных, публіцыстычных твораў. За такую неверагодную працаздольнасць пісьменнік занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Гэта яму прыпісваюць выраз «Ні дня без радка». Многія яго творы былі напісаны на матэрыяле малой радзімы.

Віртуальная рэканструкцыя выбраных твораў Юзафа Крашэўскага стала інтэрнацыянальным праектам. Над ёй шчыравалі супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Горкага, Ровенскай абласной бібліятэкі, бібліятэкі польскага горада Бяла-Падляска і музея Юзафа Крашэўскага ў Раманаве (ваколіца Бялай-Падляскі). Два дыскі ўмясцілі ў сябе самыя цікавыя творы аўтара, бібліяграфію, а таксама яго музыку, жывапіс. Літаратурная спадчына пісьменніка даецца на беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай мовах.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**


Белинвестбанк

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.**

Наименование банка ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 972 952,8 | 938 440,3 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 4 793,9 | 4 771,9 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 830 274,1 | 2 722 420,7 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 137 193,0 | 777 879,2 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 3 057 954,8 | 3 145 393,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 16 101 885,1 | 15 012 882,8 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 835 850,8 | 799 700,8 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | 77 973,7 | 78 419,1 |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 1 915,1 | 1 915,1 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 1 735 575,2 | 1 700 595,5 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 1 096,8 | 1 094,0 |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Прочие активы | 1111 | | 234 695,4 | 277 555,0 |
| **16** | **ИТОГО активы** | **11** | | **25 992 160,7** | **25 461 067,6** |
| 17 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 18 | Средства Национального банка | 1201 | | 447 209,5 | 1 188 159,6 |
| 19 | Средства банков | 1202 | | 3 366 866,8 | 2 798 733,8 |
| 20 | Средства клиентов | 1203 | | 17 454 108,6 | 16 818 587,8 |
| 21 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 1 027 085,4 | 1 039 247,1 |
| 22 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1206 | | 469 711,3 | 441 685,9 |
| **24** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **22 764 981,6** | **22 286 414,2** |
| 25 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 1 167 408,3 | 1 167 408,4 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,1 | 0,1 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 115 929,9 | 115 842,6 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 1 147 517,6 | 1 148 302,5 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 795 737,4 | 742 655,0 |
| 31 | ВСЕГО капитал, принадлежащий головной организации – банку | | | 3 226 593,3 | 3 174 208,6 |
| 32 | Доля неконтролирующих акционеров | | | 585,8 | 444,8 |
| **33** | **ВСЕГО капитал** | **121** | | **3 227 179,1** | **3 174 653,4** |
| **34** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **25 992 160,7** | **25 461 067,6** |

**КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2014 г.**

Наименование банка ОАО «Белинвестбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 824 690,9 | 628 476,0 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 647 400,8 | 489 132,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 177 290,1 | 139 343,2 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 168 709,1 | 134 265,5 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 28 735,5 | 25 660,2 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 139 973,6 | 108 605,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 77,5 | 157,6 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 7 124,0 | 1 566,7 |
| 9 | Чистый доход от операций с иностранной валютой | 205 | | 10 088,9 | 39 025,2 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 36 150,0 | (4 086,0) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 38 204,6 | (845,4) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 47 700,4 | 27 869,6 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 295 006,6 | 211 612,2 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 27 010,7 | 29 936,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 58 182,6 | 71 778,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 4 231,9 | 9 049,8 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **53 950,7** | **62 729,0** |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | 302,8 | (475,3) |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| **20** | **Итого прибыль (убыток)** | | | **54 253,5** | **62 253,7** |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 54 112,6 | 62 163,6 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | 140,9 | 90,1 |

**И.о. председателя Правления** **А.В. Сокирко**

**Главный бухгалтер** **А.Н. Сырокваш**

Консолидированный отчет ОАО «Белинвестбанк» размещен на официальном сайте банка – **http://www.belinvestbank.by/bank-profile/key_performance_indicators/nsfo/quarterly_report_belinvestbank/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3 выдана Национальным банком Республики Беларусь 3 июня 2013 г.

146 КОНТАКТ-ЦЕНТР

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29, УНП 807000028

**www.belinvestbank.by**


# ГАНАРЫЦЦА МІНУЛЫМ — БУДАВАЦЬ БУДУЧЫНЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэтыя сімвалічныя даты сталі нагодай для сур'ёзных дыскусій і разважанняў. Невыпадкова ў Нацыянальнай акадэміі навук пры падтрымцы Міністэрства абароны адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: памятнае лета 1944 года». Навукоўцы, архівісты, грамадскія дзеячы з Беларусі, Расіі і Польшчы, а таксама прадстаўнікі сілавых ведамстваў, ветэраны вайны, студэнты і курсанты вышэйшых навучальных устаноў краіны сабраліся ў беларускай сталіцы. Прыбылі і дэлегацыі Азербайджана, Арменіі, Таджыкістана і Туркменістана, ваенныя аташэ іншых краін.

— У жыццё ўступае новае пакаленне, — зазначыў **намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль ТОЗІК.** — І яно не павінна забывацца, што гісторыя — гэта палітыка, павернутая назад. Без ведання гісторыі не можа быць патрыёта. Без ведання мінулага, без беражлівага стаўлення да яго ў краіне не можа быць добрай будучыні. Таму такія мерапрыемствы асабліва важныя для моладзі. Асабліва калі сёння многія спрабуюць збіць з панталыку новае пакаленне, скажаючы гісторыю, спрабуючы перабудаваць яе пад свае амбіцыі. А нам не трэба нічога перабудоўваць. Нам проста неабходна памятаць, як усё было. Вядома, гэта тычыцца не толькі Вялікай Айчыннай вайны. Беларусам у сваёй тысячагадовай гісторыі саромецца няма чаго: мы на ўсіх яе этапах паводзілі сябе годна. Гэта трэба ведаць, гэтым трэба ганарыцца. Будзем ганарыцца мінулым — будзем паспяхова будаваць сваю будучыню.

На канферэнцыі падрабязна аналізавалася падрыхтоўка і ход Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі, якая з'яўляецца адной з найбольш выдатных не толькі ў Вялікай Айчыннай, а і ва ўсёй Другой сусветнай вайне. Абмяркоўваліся важнейшыя праблемы ў інтэрпрэтацыі і асвятленні мінулых падзей. Яшчэ раз падкрэслівалася вялікая роля партызанскага руху і падпольнай барацьбы на акупаванай тэрыторыі, адзначалася савецкае вайсковае мастацтва ў перыяд вызвалення Беларусі. Не засталіся без увагі і пытанні захавання, перадачы агульнай гістарычнай памяці.

— Няма другой такой рэспублікі ў былым Савецкім Саюзе, народ якой больш пацярпеў у гады Вялікай Айчыннай вайны, — перакананы **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН.** — На постсавецкай прасторы і ва ўсім свеце я не бачу падобных прыкладаў беражлівых адносін да памяці народа. У нашай краіне праводзяцца шматлікія мерапрыемствы, а сёлета адкрываецца і новы музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Колькі ў нас абеліскаў, дагледжаных брацкіх магіл, пахаванняў невядомых салдат, — усё сведчыць аб народнай памяці. Прыняўшы гэтую эстафету ў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, мы павінны перадаць яе сваім дзецям, унукам і праўнукам. Дзеля таго, каб для іх гэтая вайна не была чужой, каб яны не ўспрымалі яе як аддаленую гістарычную падзею, суперажывалі, ведалі добра гісторыю і разумелі, што зрабілі іх прадзеды, каб яны шчасліва жылі ў свабоднай краіне.

Міністр абароны агучыў новую ініцыятыву беларускага ваеннага ведамства аб стварэнні народнага помніка «Салдатам 41-га».

— У нас вельмі шмат помнікаў, абеліскаў і стэл на тэрыторыі краіны, — патлумачыў Юрый Жадобін. — У асноўным усе яны прысвечаны вызваленню краіны ці тым падзеям, якія адбываліся ў партызанскім і падпольным руху. Ёсць невялікія барэльефы на Брэсцкай крэпасці і шэрагу іншых будынкаў, усталяваныя ў памяць салдатам і камандзірам 1941 года. Але мне здаецца, што мы мала аддалі даніну памяці тым, хто загінуў у першыя дні і тыдні вайны. Невыпадкова сёння распрацоўваецца пытанне аб стварэнні помніка «Салдатам 41-га». На мой погляд, было б правільна, каб ён з'явіўся ў раёне Ваўкавыска — Ружанаў — Слоніма, дзе савецкія войскі 3-й і 10-й армій на працягу двух дзён вялі жорсткія баі з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Як расказваюць ветэраны, гэты ўчастак называлі «дарогай смерці»: тут загінула вялікая колькасць чырвонаармейцаў. Такім чынам у нас з'явіцца магчымасць аддаць даніну памяці ўсім байцам і камандзірам 41-га, якія загінулі на тэрыторыі Беларусі і заклалі аснову нашай Перамогі.

Як падкрэсліў **старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ,** для беларусаў тэма Вялікай Айчыннай вайны заўсёды будзе актуальнай. «Пастаянна адкрываюцца новыя факты, праводзяцца новыя даследаванні, якія патрабуюць абагульнення і сістэматызацыі, каб нам было што пакінуць сваім нашчадкам», — паведаміў акадэмік.

У гэтым можна было пераканацца падчас выставы, арганізаванай у акадэміі. Вялікая колькасць даследаванняў, шматлікая літаратура. Сёння ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук створаны спецыяльны аддзел, прысвечаны гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, які якраз і займаецца новымі распрацоўкамі. Дарэчы, многія вучоныя ўстановы ў гады вайны абаранялі краіну са зброяй у руках, большасць з іх дамоў так і не вярнулася. Вельмі доўга потым давялося аднаўляць гэты патэнцыял. За гады вайны гітлераўцы разбурылі будынак, ад якога засталіся толькі калоны. Былі разрабаваны навуковыя фонды, бібліятэка. Усё прыйшлося пачынаць з пачатку. І сёння можна смела казаць, што больш ніякая іншая ўстанова краіны не праводзіць столькі даследаванняў па тэме апошняй вайны, не выдае столькі тэматычнай літаратуры. Прычым фундаментальнай, заснаванай на дакументах, на фактах.

**Для беларусаў тэма Вялікай Айчыннай вайны заўсёды будзе актуальнай. Пастаянна адкрываюцца новыя факты, праводзяцца новыя даследаванні.**

Немалы ўклад у захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне ўносяць і дзяржаўныя архівы краіны. Менавіта яны ахвотна дзеляцца з навукоўцамі новымі звесткамі, каб яны сталі вядомымі шырокай аўдыторыі.

— Сёння ў дзяржаўных архівах Беларусі на пастаянным захаванні знаходзіцца каля 13 мільёнаў спраў — з 1391 года і да сённяшняга часу, — расказаў **дырэктар дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі Уладзімір АДАМУШКА.** — Гэта вялікая гістарычная спадчына, якую мае не кожная краіна свету. Значны масіў дакументальнай інфармацыі адносіцца да гісторыі войнаў. Большую частку складаюць звесткі перыяду Вялікай Айчыннай вайны: каля 400 тысяч спраў, з якіх звыш 250 тысяч адзінак на папяровых і больш 100 — на аўдыявізуальных носьбітах. Таксама ў нас ёсць імянная картатэка на ўсіх удзельнікаў партызанскага руху і падполля на тэрыторыі Беларусі, якая змяшчае звыш 400 тысяч персаналій.

Дзяржаўнымі архівамі выпускаецца ў свет вялікая колькасць зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, рэалізуюцца шматлікія выставачныя праекты, прысвечаныя гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У межах выдавецкай і экспазіцыйнай дзейнасці адкрываюцца малавядомыя і нават невядомыя старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у навуковы зварот уводзяцца новыя дакументы. За апошнія 20 гадоў дзяржаўнымі архівамі краіны створана 69 зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, а таксама даведачных выданняў, прысвечаных Другой сусветнай вайне. Пагадзіцеся, немалая лічба для нашай рэспублікі.

Пра тое, што праводзіць такія мерапрыемствы, як навукова-практычная канферэнцыя, лепш з удзелам замежных спецыялістаў, выказаліся ўсе ўдзельнікі форуму.

— Трэба, каб у нас быў адзіны погляд на гэтую тэму, бо вайна — з'ява складаная ў грамадска-палітычных адносінах, — патлумачыў **прэзідэнт Акадэміі ваенных навук Расійскай Федэрацыі генерал арміі ў адстаўцы Махмут ГАРЭЕЎ.** — Прычым больш актуальнай тэмы ўжо не бывае. Многія высновы і ўрокі з Беларускай аперацыі маюць значэнне і для цяперашняга дня. Пры яе планаванні і правядзенні была праяўлена вялікая творчасць і хітрасць. «Баграціён» — найбольш павучальная і выдатная аперацыя, якая характарызуе савецкае ваеннае мастацтва не толькі часоў Вялікай Айчыннай вайны, а і Другой сусветнай, у якой ніколі не позна вучыцца.

Як прызнаўся **ваенны аташэ Рэспублікі В'етнам Нгуен Ба ХІЕН,** для іх вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — таксама свята. «Мы нешта падобнае праходзілі, толькі нашымі ворагамі былі амерыканцы, — расказаў старшы палкоўнік. — У нас так кажуць: закрыем, але не забудзем мінулае. Усё часцей назіраюцца спробы перапісаць гісторыю. Мы не дадзім! Таму правядзенне падобных канферэнцый будзе дарэчы не толькі ў выпадках святкавання пэўных юбілеяў, а ўвогуле без усялякіх дат: сістэматычна і рэгулярна. Мы павінны не толькі нагадваць аб сваім мінулым, а і выхоўваць на яго аснове патрыятызм, гонар за сваіх продкаў, каб моладзь не забыла іх подзвіг».

Мяркуем, што наступны год стане багатым на шматлікія навуковыя канферэнцыі, культурна-асветніцкія і іншыя праграмы. І хоць яны будуць прымеркаваныя да святкавання юбілею Вялікай Перамогі, гэта стане добрай нагодай для працягу традыцый, абмеркавання сумесных праектаў, якія будуць ажыццяўляцца на міжнароднай арэне ўжо пасля такіх знакавых дат.

**Вераніка КАНЮТА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Усё пра Еву

# І НА ПРАЦЫ ЎДАРНІЦА, І ПАСЛЯ ПРАЦЫ…



**У нашай краіне да наступнага лета будуць вызначаць, як мужчыны і жанчыны выкарыстоўваюць сутачны фонд часу. Праект рэалізуе Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы Фонду ААН у галіне народанасельніцтва (ЮНФПА) і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ).**

Апошнія такія даследаванні праводзіліся ў 1990 і 2004 гадах. Яны даволі важныя для ацэнкі якасці жыцця насельніцтва, таго, наколькі жанчына ўцягнутая не толькі ў аплатную працу, але і ў хатні клопат — работу, за якую атрымлівае толькі маральнае ўзнагароджанне.

— Атрыманыя вынікі дазволяць ацаніць прагрэс у забеспячэнні роўных магчымасцяў для мужчын і жанчын, а таксама будуць выкарыстаны для вызначэння асноўных напрамкаў гендарнай і сямейнай палітыкі ў краіне, — кажа **в. а. каардынатара праграм ЮНФПА Таццяна ПРАНЬКО.**

Структура і праграма абследавання бюджэту часу распрацавана паводле міжнародных стандартаў, што дазволіць у будучыні супаставіць атрыманыя звесткі з іншымі краінамі.

Абследаванне працягнецца 12 месяцаў. Кожнаму члену хатняй гаспадаркі (гэта 6 тысяч спецыяльна выбраных гаспадарак) ва ўзросце пасля 10 гадоў давядзецца зрабіць поўны хранаметраж двух сутак (працоўнага і выхаднога дня). Дарослыя рэспандэнты — ад 15 гадоў і старэйшыя — будуць весці спецыяльныя дзённікі, дзе будуць пазначаць працоўны час, час на навучанне, вядзенне хатняй гаспадаркі, догляд дзяцей і г. д. Гэта дазволіць у выніку атрымаць інфармацыю аб суадносінах працоўнага і свабоднага часу ў розных групах насельніцтва, асноўных відах адпачынку, наяўнасці часу і магчымасцяў для адукацыі і развіцця.

Удзельнікі абследавання ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў будуць пазначаць у спецыяльным дзённіку час, затрачаны на навучанне ў школе, выкананне хатніх заданняў, стасункі з сябрамі, выкарыстанне інтэрнэту, а таксама пазначаць час, які ім удзяляюць дарослыя члены сям'і.



Яшчэ да таго, як стартавала паўнамаштабнае рэспубліканскае даследаванне, некалькі журналістаў розных СМІ трапілі ў фокус-групу, каб адказаць на больш за сотню пытанняў (разам са сваімі партнёрамі па шлюбе).

**Спецыялісты Белстата прааналізавалі звесткі, атрыманыя ад нашай фокус-групы. І атрымалася, што не такая я ўжо і асаблівая…**

**Рабочы дзень (у% ад сутачнага фонду часу)**

| | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|
| Працоўны час | 40% | 34%, |
| Час на вядзенне хатняй гаспадаркі | 6% | 15% |
| Догляд дзяцей | 3,2% | 3,5% |
| Вольны час | 9% | 7% |
| Час на задавальненне фізіялагічных патрэб | 41% | 39%. |

**Выхадны дзень (у% ад сутачнага фонду часу)**

| | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|
| Час на вядзенне хатняй гаспадаркі | 12% | 23% |
| Догляд дзяцей | 2,2% | 2,1% |
| Вольны час | 33% | 25% |
| Час на задавальненне фізіялагічных патрэб | 49% | 49% |
| Дапамога сваякам і знаёмым | 2,4% | 1,5% |

У спецыяльных дзённіках — за будны і выхадны дні — мне і майму мужу давялося пазначаць, што называецца, кожны наш крок. Асноўны від дзейнасці, паралельны від дзейнасці, месца знаходжання або спосаб перасоўвання, з кім менавіта даводзілася быць падчас таго ці іншага занятку. Даволі цікава. Асабліва калі прыходзіш да высновы, што працуеш (аказваецца!) круглыя суткі і без выхаднога!

Наогул вынікі даследаванняў, у тым ліку замежных, паказваюць, што ў жанчын занадта шмат «працоўнага часу», што адбіваецца на іх адпачынку і дабрабыце. Міні-даследаванне журналісцкай групы паказала, што ў будны дзень жанчыны трацяць на хатнюю гаспадарку 3 гадзіны 38 хвілін. У выхадны дзень — 5 гадзін 28 хвілін. Словам, **у сярэднім жанчыны дадаткова працуюць на «хатняй ніве» 4 гадзіны 10 хвілін штодня!**

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ■ Нататнік Яго жонкі



Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар
часопіса «Маладосць»

# НАКОНТ РЭКЛАМЫ

— Там рэклама, — кажа Ён.

— Ды яна ўжо даўно скончылася!

— Не скончылася.

— Халера, там ужо працягваецца кіно! *І пакуль мы тут атрымліваем асалоду ад крывавай бойкі паміж Дзікім і браткамі, там Карэн Георгіевіч і Мікалай Арсенавіч пяць разоў наноў пасварыліся. Мякенька так, інтэлігентненька, далікатна…* Ну раптам скончылася?

— Ды не.

— А як ты можаш гэта ведаць, га? Ну скажы, як? Не можаш жа ты гэтага ведаць, не пераключыўшы канал. Добра, *«Апошняга з Магікян» праглядзелі — не вернеш. А вось жа цікавая перадача ідзе. Вось жа інтрыга з інтрыг! Перасталі ўжо лічыць Барбару нясвіжскай Чорнай паннай ці ўсё яшчэ верацъ у гэтую бязглуздзіцу?* Слухай, а што мы ўвогуле глядзім?

— Усё запар. Табе нецікава?

— Не, чаму?.. Цікава…

Я, здаецца, ведаю самы сапраўдны з найсапраўднейшых, самы істотны сэнс нязграбненькага слоўца «валтузня». Гэта калі Ён, мой муж, пераключае тэлевізійны канал з раптоўна набеглай рэкламы на нешта яшчэ больш няўцямнае, што ідзе ў гэты час на нейкім іншым канале. І мы ўжо глядзім гэтае нешта. Напэўна, да новай рэкламы. А пасля нас чакае «чарговае ўключэнне». Гэта як місія ў камп'ютарнай гульні: я з усяе моцы прыстасоўваюся да кожнай новай выявы на экране, каб, пакінуўшы ў памяці фантастычныя «захаванні», пераскокваць на новыя «ўзроўні». Карысць ад такой гульні відавочная, але чамусьці выключна аднабаковая: дзіўна ці не, але Ён пасля не памятае ніводнага фільма з тых, што так апантана і прагна глядзеў, а я — наадварот, памятаю ўсё, і вельмі добра. Хоць, магчыма, нехта скажа, што фільмаў пра супрацоўніцтва доктара Ватсана з камісарам Каломба не існуе. І пра авантуры Лары Крофт у фортах Брэсцкай крэпасці не знялі яшчэ. Ну, няхай сабе. Але мне можна зайздросціць: я — бачыла!

Усяму віною, зразумела, рэклама. Ну, гэта каб не сказаць, што вінаваты Ён — што не любіць рэкламу. Бо я, на самой справе, згодна была б глядзець нават і рэкламу — напрыклад пра тое, як дасціпная дзяўчына, замовіўшы ў першым жа месцы (куды з голаду трапіла) гамбургер, бульбу-фры і малочны кактэйль, з вуснаў бібліятэкара даведваецца, што яна, аказваецца, не «девушка», а — «деушка». Панізіўшы голас, «прыкалістка»… зноў замовіла тыя ж самыя гамбургер, бульбу-фры і малочны кактэйль. Малайчына. І выдатная рэклама адукацыйнага праекта. Мне ўвогуле сучасныя прома-ролікі ў сваёй большасці здаюцца або сімпатычнымі па сутнасці, або шэдэўральнымі па ідэі. Так-так. Ёсць, праўда, што ні кажы, адмысловыя падыходы…

— Слухай, колькі ён яшчэ будзе гэтую локшыну на нечыя вушы вешаць?

Гэта Ён пра камбайнера, якога (пакуль летні дзень год корміць) быццам бы толькі локшына з пакецікаў і выручае. Гэта чые камбайнеры так харчуюцца? Гэта як трэба не паважаць іх працу, каб за яе, празваную ні многа ні мала бітвай за ўраджай, так карміць?

— Слухай, а ты вось вазьмі і напішы пра ўсё гэта, — раіць мне Ён.

— Ведаеш, у мяне даўно ўжо саспела ідэя прысвяціць нашай рэкламе вялікі змястоўны праект. Праўда-праўда. Толькі… Пісаць трэба пра вартае.

Пастанавіла: пасля «палескіх» нумароў бярэмся ў «Маладосці» асвятляць айчынную рэкламу. Ну каму як не стваральнікам беларускамоўнага інтэлектуальнага чытання хварэць за тое, каб беларускамоўная рэклама была беларускамоўнай?..

А Яму ўсё роўна дзякуй — за падказку

■

## ■ Матуліны занатоўкі

# КАПІТАЛЬНЫ «РАМОНТ»

## ПАЧНІЦЕ З СЯБЕ

**«Усё можна выправіць, — раз за разам кажу я свайму сыну. — Цацку адрамантуем, кубак склеім, горла вылечым. Выправіць можна ўсё і заўжды!» І ён «выпраўляе» — расказвае мне пра лісу, якая была вымушана выплюнуць Калабка, бо надта гучна спяваў сваю песеньку ў яе жываце. І суцяшае, калі я, адмовіўшыся ўзяць яго «на ручкі», пачынаю наракаць, што, маўляў, не такая моцная, як тата: «Не перажывай, ты падрасцеш і станеш мужчынам!»**

Я і праўда лічу, што за вельмі рэдкім выключэннем выправіць можна практычна ўсё і заўсёды. Урэшце, задаўшыся мэтай, можна і біцэпсы сабе нарасціць… Але аднойчы, запаліўшы дзве свечкі на Антонавым імянінным торце і выпадкова зірнуўшы ў люстэрка паміж кухняй і гасцёўняй, міжволі адзначыла, што біцэпсы ў мяне і так неблагія (пэўна, практыкаванні з каляскай у нашым доме без ліфта не прайшлі дарэмна). Вось толькі агульнае відовішча мяне не надта парадавала — здаецца, яшчэ не так даўно я памятала сябе зусім іншай…

Да нараджэння Антона «пытанні ўзросту» мяне не надта займалі. У мяне была неблагая праца, былі грошы і разам з імі — упэўненасць у вечнай маладосці. Ёсць жа розныя «ботаксы», разважала я, дапускаючы калі-небудзь нават пластычную аперацыю. І шчыра здзіўлялася, калі чула ад каго-небудзь, што недаравальна заводзіць дзіця пасля юбілею, які ў народзе не прынята святкаваць. Маўляў, маці-бабуля — тое яшчэ выпрабаванне для дзіцячай псіхікі. Гэта з дасягненнямі сучаснай касметалогіі?

Адзначыўшы ў кампаніі паспяховых сябровак сваё 40-годдзе, я неўзабаве нарадзіла сына і… на працяглы час забылася на сябровак, касметолагаў і на саму сябе. Калі ж мне, пазбаўленай сну на доўгія месяцы, зноў захацелася «ў людзі», высветлілася, што грошай на касметолага, а тым больш на ботакс разам з пластычнай аперацыяй ужо няма.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Але ў мяне засталося штосьці іншае. Мая жалезабетонная ўпэўненасць, што ўсё можна выправіць.

Ведаеце, як худзела мая найлепшая сяброўка? Большую частку свайго жыцця яна была жанчынай не проста з формамі, а з формамі манументальнымі. Але толькі ў 40 гадоў перастала грашыць на «спадчыннасць» і «абмен рэчываў» і запісалася ў фітнес-залу. Спачатку Таццяна займалася праз дзень, потым штодзённа, але формам яе нічога не рабілася. І так было амаль тры гады! А потым сяброўка трапіла ў Амерыку і на фоне тамтэйшых жанчын упершыню адчула сябе ледзь не дзюймовачкай. З гэтым новым усведамленнем і вярнулася ў сваю фітнес-залу. Праз лічаныя месяцы сяброўку не пазнаваў ніхто.

Дарэчы, я і сама добра памятаю, як, прыехаўшы па мяне ў піянерскі лагер, маці бегала вакол аўтобуса, упарта не заўважаючы маю «пасталелую» постаць — кармілі там выдатна, і за нейкія дзве лагерныя змены я стала шырэйшай за матулю. Той жнівеньскі дзень стаў для мяне «момантам ісціны» — увосень я запісалася ў секцыю гімнастыкі ў прыгараднай спартыўнай школе, балазе бралі туды, не зважаючы на вагу і ўзрост. У адрозненне ад маладзейшых сябровак, трапіць у рэспубліканскую зборную мне, вядома, «не свяціла», але я ўсё ж засвоіла там дзве рэчы, што значна спрасцілі мае будучае жыццё. А менавіта: найлепшая дыета — дыета на ўсё жыццё, а добрая фігура — гэта найперш добрая пастава. Нават падчас цяжарнасці я на тое не забывалася. Але потым галава пайшла такім кругам… І аднойчы я злавіла сябе на думцы, што ўжо не такая юная і жвавая, каб займацца выхаваннем малога гарэзы. І імгненна ўбачыла пацвярджэнне гэтага ў люстэрку.

А крыху пазней, у каторы раз спрабуючы адшукаць найбольш эфектыўны спосаб выхавання для свайго малога, я натрапіла на чарговую нетрадыцыйную тэорыю пад назвай «эпігенетыка», заснавальнікам якой стаў амерыканскі генетык з класічнай медыцынскай адукацыяй і прозвішчам Ліптан. Яму ўдалося абсалютна навуковым чынам растлумачыць прынцып дзеяння плацэба, у выніку чаго ён прыйшоў да высновы, што аднымі толькі думкамі любы чалавек можа ўплываць на ўласны арганізм якім заўгодна чынам. І нават мяняць свой генетычны код. Толькі «працуюць» тут не павярхоўныя думкі, а тыя, што нашмат глыбей — у падсвядомасці.

**Ёсць розныя методыкі, з дапамогай якіх свае глыбінныя перакананні можна паспрабаваць змяніць.**

Ёсць розныя методыкі, з дапамогай якіх свае глыбінныя перакананні можна паспрабаваць змяніць. Менавіта паспрабаваць — 100-працэнтна дзейсных методык не прыдумана. Але некаторым людзям удаецца настройваць уласны мозг на здаровы лад аўтаматычна. Падчас сваіх эксперыментаў Ліптан прыйшоў да высновы, што такія шчаслівчыкі вырастаюць з дзяцей, якія сутыкнуліся з найменшай колькасцю псіхічных траўмаў у дзяцінстве (калі дакладна — ва ўзросце да шасці гадоў). Менавіта таму двое людзей з аднолькавай генетычнай схільнасцю, напрыклад, да ракавых захворванняў пражывуць вельмі рознае жыццё. Адзін прайграе барацьбу з хваробай, а другі з ёй нават не сутыкнецца… Калі ўсё так і ёсць, дык Анджаліна Джалі, напэўна, мае рацыю, робячы аперацыю за аперацыяй для прафілактыкі раку. Дзяцінства там было далёка не шчаслівым…

Затое ў мяне была бабуля, якая з лішкам кампенсавала любыя дзіцячыя расчараванні. І гэта яна нястомна паўтарала — усё можна выправіць. Нават калі табе балюча, варта расправіць плечы — і хмурыя маршчыны з твару пачнуць збягаць самі сабой. Між іншым, так і ёсць.

Цяпер я гляджуся ў люстэрка значна часцей. І ўсё часцей мне падабаецца тое, што я там бачу. Магчыма, сапраўды дапамаглі парады Агідэліі, на блог якой я своечасова натрапіла (у інтэрнэт-прасторы такое імя належыць адзінай жанчыне-касметолагу, якая рашуча маніфестуе супраць розных «уколаў прыгажосці» і іншых традыцыйных прыёмаў сучаснай касметалогіі). Дзякуючы ёй я пераканалася, што самыя дзейсныя касметычныя сродкі ў мяне заўжды былі пад рукою. Зрэшты, бабуля таксама вучыла калісьці, што настой рамонку і ваўчкоў разам з алеем лаванды — чароўныя сродкі не толькі для немаўляці. Мая любая бабуля, якая выйшла замуж пяты раз, горача закахаўшыся ў 68 гадоў…

**Марына БЕРАЗЕНСКАЯ**

■

## ■ Паміж намі

# САСТУПІ… І ВЫЙГРАЙ!

## або Парады мудрых жанчын

**Як паводзіць сябе мудрая жанчына ў складаных сямейных сітуацыях? Яна не спрабуе навязаць сваю волю мужчыну, не імкнецца пераканаць яго ў іншым. Ёй нават спрачацца з ім не трэба, бо яна ведае: саступіш у меншым — выйграеш у большым.**

### Не кіруйце, а накіроўвайце

Галоўная жаночая мудрасць: ніякага саперніцтва і жадання кіраваць усім у адносінах — мужчыны гэтага не любяць. Пакіньце ім ініцыятыву, толькі крыху накіроўвайце свайго партнёра, і ўсё — ён сам знойдзе спосаб дасягнуць мэты.

Напрыклад, вам шчыра хочацца даказаць яму, што ехаць сярод зімы з сябрамі на пікнік — адзначаць ваш дзень нараджэння — неяк неразумна. Значна лепш схадзіць ва ўтульны караоке-клуб або ў рэстаран. Але як толькі вы пачняце яму пра гэта гаварыць, можаце быць упэўнены: упрэцца, як баран. І калі ў вашых паводзінах упартасці будзе менш, вы абавязкова пагодзіцеся на дзень нараджэння пад скупымі праменямі зімовага сонца.

Даволі распаўсюджаная памылка ў такой сітуацыі — ваша настойлівасць у доказе сваёй праваты. Мужчыны не любяць адчуваць (а тым больш прызнаваць) сваіх памылак. Для іх гэта пройгрыш, а яны не жадаюць прайграваць — лідарства закладзена ў іх прыродай. Мудрая жонка пойдзе іншым шляхам: «Добра, дарагі. Няхай на вуліцы і холадна, але калі ты хочаш — паедзем на шашлыкі». Усё — спрачальнік абяззброены. Праз дзень вы абавязкова пачуеце: «Пэўна, падмарозіць да выхадных». А яшчэ праз пару дзён ён пяшчотна вас абдыме і скажа: «Каток, а можа, ну іх, гэтыя шашлыкі? Сходзім у рэстаран, як людзі». І вось тут самае галоўнае — ніякіх «Я ж табе казала!». Мудрая жанчына млява прыжмурыць вочы і прамурлыкае: «Мне здаецца, ты маеш рацыю».

### Задаволены муж — задаволена жонка

Яшчэ адно правіла, якім павінна кіравацца жанчына. Запомніце: чым лепш мужчыну будзе з вамі, тым менш яму будзе хацецца да сяброў, у гараж і, нарэшце, да іншай жанчыны. Больш за тое, усвядоміўшы, якім скарбам (у вашай асобе) яго надзяліў лёс, мужчына будзе старацца даставіць гэтаму скарбу (значыць — вам) радасць. Ён, менавіта ён сам павінен прыйсці да такой складанай, але аб'ектыўнай высновы: вы — самая лепшая жанчына на свеце.

А неад'емная частка самай лепшай жанчыны — пачуццё гумару. Яна заўсёды падбадзёрыць мужа ў цяжкую хвіліну вясёлай гісторыяй або анекдотам, здолее разрадзіць абстаноўку.

### Дарослага не пераробіш

Мудрая жанчына не імкнецца перарабіць свайго мужчыну. Яна проста ведае — гэта бессэнсоўна, таму адразу выбірае таго, хто ёй падыходзіць. А калі ёй і спатрэбіцца развіць у мужчыну пэўныя якасці і звычкі, яна зробіць гэта акуратна.

Калі вы робіце заўвагу мужчыну, старайцеся падаць яе проста як параду, а не як звычайную крытыку «ў лоб». Ніколі не рабіце заўвагі пры людзях — гэта зневажае, лепш выйдзіце ў ціхае месца або зрабіце гэта дома.

### Ваш муж — ваш выбар

Вы з ім сустракаліся, вы вылучылі яго з усіх сваіх паклоннікаў, вы заварылі ўсю гэту кашу з вясельнай сукенкай, лімузінам і лялькай на капоце. Вы расказвалі сяброўкам, які ён цудоўны і пяшчотны. А цяпер збіраецеся расказаць усім, які ж ён усё-такі эгаіст, гультай і падманшчык? Не спяшайцеся! Сёння вы пасварыліся, а праз пару дзён высветліцца, што вы проста не зразумелі адно аднаго. І муж, па-ранейшаму цудоўны і пяшчотны, робіць падарункі, жартуе і нават… знаходзіць час схадзіць з вамі да стаматолага (вы ж так баіцеся лячыць зубы!). Вы зможаце ўбачыць яго ранейшымі вачамі, а вось навакольныя — ужо не.

### Давер і яшчэ раз давер

Калі вы ўпэўнены ў тым, што муж не будзе падманваць вас у галоўным або ўтойваць штосьці значнае, дык ці маюць значэнне нейкія дробязі? Ёсць мноства рэчаў, пра якія жонкам сапраўды лепш не ведаць. Ён пазней, чым звычайна, затрымаўся на працы? Не сказаў, куды ездзіў раніцай у суботу? У галаву, вядома ж, закралася думка: праверыць яго званкі на мабільніку… А ў панядзелак вы прачынаецеся і бачыце побач з падушкай каробачку з новенькім мабільным тэлефонам і букет руж з запіскай: «Зайка мая! Мы разам ужо два гады! Я кахаю цябе!». Таму наступную параду глядзіце ніжэй.

### Глыток свабоды

Старайцеся праводзіць вольны час разам, але дазваляйце сабе і адпачываць адно ад аднаго. Няхай у кожнага з вас застанецца права на асабістую прастору: будзе гэта ваша «вылазка» з сяброўкамі ў кавярню або паходы мужа з прыяцелямі на хакей. А вось штохвілінныя «кантрольныя званкі», скрупулёзнае вышукванне доказаў здрады ў кішэнях, наадварот, вельмі шкодзяць сямейнаму жыццю.

### Вы — каманда!

Гэта важна ўсвядоміць з першых дзён сумеснага жыцця. Цяпер усе паражэнні і перамогі — вашы агульныя. Вы ведаеце адно пра аднаго больш, чым хтосьці іншы, а значыць, падбадзёрыць ці пакрыўдзіць можаце мацней за ўсіх. Муж цэлымі днямі працуе, а потым вечарамі гаворыць аб працы? Па выхадных яму тэлефануюць падначаленыя? Ваша цярпенне заканчваецца?



А цяпер уявіце, што будзе, калі ён пазбавіцца працы… Не варта раўнаваць мужа да яе. Яго праца — гэта дабрабыт вашай сям'і. І, нягледзячы на тое, што ў розных сем'ях бывае па-рознаму, вельмі важна з самага пачатку фарміраваць «пачуццё пляча» — упэўненасць у тым, што вы ўжо дакладна не падвядзяце. Мудрая жанчына ўсяляк падкрэсліць значнасць мужа, падтрымае аўтарытэт і ўмацуе яго самаацэнку.

### Дагаджаць без фанатызму

Зразумела, ва ўсіх намаганнях дагадзіць свайму абранніку не павінна быць фанатызму. Ніколі не забывайце пра сябе, займайцеся самаўдасканальваннем. Кожны мужчына хоча ганарыцца сваёй жанчынай, расказваць сябрам пра яе прыгажосць, розум і дасягненні. Дазвольце яму гэту слабасць!

Калі па вечарах вы будзеце сядзець ля вакна і, як адданая котка, чакаць сужэнца з працы, ён вельмі хутка прывыкне да таго, што вы — заваяваны аб'ект, на ўтрыманне якога больш не варта траціць сілы. А вось актыўная жыццёвая пазіцыя, рознабаковыя захапленні будуць пастаянна падахвочваць мужа займець хаця б частку вашага вольнага часу.

### Жанчына — гэта свята!

Стварайце атмасферу радасці ў доме. Наладжвайце святы для дваіх, песціце адно аднаго сумеснымі прагулкамі, раптам прызначанымі спатканнямі, мілымі SMS-камі — гэта дапамагае вызваляцца ад грузу праблем і аднаўляць душэўную раўнавагу.

А як прыемна рабіць падарункі! Пачніце першай — і ваш мужчына абавязкова адгукнецца. Падоўжыце сабе цукерачна-букетны перыяд, бо з'яўленне штампа ў пашпарце рамантыкі не адмяняе. І памятайце: шлюб — ваш самы важны праект у жыцці, які патрабуе шмат энергіі і сіл.

**Вера ФЕМІНА**

■

Утерянный бланк квитанции 1-СУ серии КС №8556003, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», прошу **считать недействительным.**

Утерянную квитанцию о приеме наличных средств (страховых взносов) серии КС 3914000 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительной.**

ОАО «Татьяна» уведомляет акционеров о праве требования выкупа акций.

Срок, в течение которого акционеры могут предоставить заявление с требованием выкупа принадлежащих им акций: с 18.06.2014 г. по 06.08.2014 г.

Срок, в течение которого осуществляется приобретение акций: 07.08.2014 г. по 05.09.2014 г.

Цена приобретения одной акции – 1 000 белорусских рублей.

Сроки, форма и порядок оплаты акций: в течение 60 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи акций, по безналичному расчету путем перечисления денежных средств на счет продавца.

Адрес, по которому будут приниматься заявления с требованием выкупа акций и заключаться договоры купли-продажи акций: г. Гомель, ул. Ак. Павлова, 26.

Количество приобретаемых акций по требованию акционеров не более 17437 штук.

В случае, если общее количество акций, предложенных для выкупа по требованию акционеров, превышает количество акций, которое может быть приобретено акционерным обществом с учетом указанного выше ограничения, акции выкупаются у акционеров пропорционально заявленным требованиям.

Приобретение акций обществом по требованию акционеров не осуществляется в случаях установления законодательством соответствующих запретов (ограничений).

Цель приобретения части простых (обыкновенных) акций: сокращение их общего количества (аннулирование) и уменьшение уставного фонда общества.

*УНП 400068248*

Утерянный представительством Белгосстраха по Московскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ № 0557017 **считать недействительным.** *УНП 100122726*

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**
доводит до сведения заинтересованных лиц

**О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

о строительстве нежилых помещений объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса – пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану».

Продовольственный магазин (5 пусковой комплекс) в г. Минске, *опубликованную в газете «Звязда» 01 июня 2013 года:*

При уплате 100% от всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м площади по экспликации помещений уменьшается на 5% и составит 25 414 600 белорусских рублей.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на нежилое помещение с другим претендентом.

Генеральный директор Н.В. Милошевский

*УНП 100071325*

## РУП «Белпочта»

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ**

по выбору подрядной проектной организации для выполнения проектно-изыскательских работ по объекту «Установка электрогидравлической уравнительной платформы встроенного типа с поворотной аппарелью на тельферной площадке, расположенной во дворе производственного корпуса здания специализированного связи по ул. Вокзальной, 22 в г. Минске».

**Процедура переговоров состоится «26» июня 2014 года в 10.00 по адресу**: г. Минск, пр. Независимости, 10. Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства – **тел. 293-55-29, 293-55-28.** *УНП 101015738*

30 июня 2014 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 23.06.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

*УНП 200050191* Совет директоров.

**ЗАО «Белтяжмаш»** (заказчик)
произведет вырубку 133 деревьев и 61 кустарника по объекту:
«Четыре крытых теннисных корта со спортивным сооружением по ул. Железнодорожная – ул. Уманская». *УНП 100625309*

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

*В опубликованную 04 апреля 2014 г. в газете «Звязда» № 62*

***проектную декларацию (о проекте строительства объекта «Застройка микрорайона «Лошица-9». 1-я очередь. Жилой дом №5 по генплану»)***
**внести следующие изменения.**

Первый абзац раздела «Характеристика объекта» изложить в следующей редакции:

Объект – административное помещение общей площадью – 101,58 м$^2$, расположенное на 1-ом этаже 115-квартирного 10-этажного крупнопанельного жилого дома серии М464-У1. Помещение строится без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарно-технических приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды). *УНП 100008115*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже имущества ОАО «Рапс»

| | |
|---|---|
| **Продавец капитальных строений** | Открытое акционерное общество «Рапс»<br>Юридический и почтовый адреса: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20.<br>УНН 6000 68 480, ОКПО 148 021 57<br>Р/с 301 220 143 0014 в филиале ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление, г. Минск, пр-т Победителей, 91, МФО 153001942, **контактный телефон: (8017) 506 92 11, 506 91 51.** |
| **ЛОТ № 1 (единым комплексом)** | |
| **Наименование предмета аукциона, краткая характеристика** | - Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (зернохранилище) с инвентарным номером 600/С-124842, общей площадью 1 474,7 кв. метров.<br>- Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (зернохранилище) с инвентарным номером 600/С-124843, общей площадью 612,0 кв. метров. |
| **Местонахождения предмета аукциона:** Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район деревни Пятевщина, площадь земельного участка 0,6619 га | |
| **Начальная цена продажи предмета аукциона:** 3 330 000 000 белорусских рублей с НДС | |
| **Шаг аукциона** | 5% начальной цены продажи предмета аукциона. |
| **Размер задатка, текущий (расчетный) счет для внесения суммы задатка** | Задаток для участия в аукционе в размере 10% от начальной цены продажи предмета аукциона (333 000 000 белорусских рублей) перечисляется на р/с 301 220 143 0014 в филиале ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление, код банка 942, УНП 600068480, получатель платежа – ОАО «Рапс». Назначение платежа – задаток 10% от начальной цены предмета аукциона **(лот № 1)** согласно условиям проведения аукциона. |
| **ЛОТ № 2 (единым комплексом)** | |
| **Наименование предмета аукциона, краткая характеристика** | - Здание нежилое (здание пропускного пункта) с инвентарным номером 600/С-121220, общей площадью 21,7 кв. метров.<br>- Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (здание склада для хранения запчастей) с инвентарным номером 600/С-121228, общей площадью 294,8 кв. метров.<br>- Здание специализированное автомобильного транспорта (здание навеса сельскохозяйственных машин) с инвентарным номером 600/С-121224, общей площадью 548,3 кв. метров.<br>- Здание специализированное автомобильного транспорта (здание автогаража с бетонной площадкой и ограждением) с инвентарным номером 600/С-121223, общей площадью 775,8 кв. метров.<br>- Здание нежилое (здание ремонтно-механической мастерской) с инвентарным номером 600/С-121227, общей площадью 401,2 кв. метров. |
| **Местонахождения предмета аукциона:** Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Крупицкий с/с, район деревни Аннополь, площадь земельного участка 1,6045 га. | |
| **Начальная цена продажи предмета аукциона:** 4 760 000 000 белорусских рублей с НДС | |
| **Шаг аукциона** | 5% начальной цены продажи предмета аукциона. |
| **Размер задатка, текущий (расчетный) счет для внесения суммы задатка** | Задаток для участия в аукционе в размере 10% от начальной цены продажи предмета аукциона (476 000 000 белорусских рублей) перечисляется на р/с 301 220 143 0014 в филиале ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление, код банка 942, УНП 600068480, получатель платежа – ОАО «Рапс». Назначение платежа – задаток 10% от начальной цены предмета аукциона **(лот № 2)** согласно условиям проведения аукциона. |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | 24.07.2014 в 15:00 по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, актовый зал. |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | по 21.07.2014 до 17:00 в рабочие дни по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, 20, кабинет юрисконсульта. |
| **Условия аукциона** | Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник и он согласен приобрести предмет аукциона (лот) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – единственный зарегистрированный участник аукциона должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета аукциона (соответствующего лота) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.<br>Победитель аукциона (единственный зарегистрированный участник аукциона) должен оплатить продавцу всю стоимость предмета аукциона (соответствующего лота) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи.<br>Победитель аукциона (единственный зарегистрированный участник аукциона) обязан возместить Продавцу стоимость фактических затрат по организации и проведению аукциона в размере и на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.<br>На единственного зарегистрированного участника аукциона распространяются правила и условия, установленные для Победителя аукциона. |

**Цель использования предмета аукциона:** не ограничивается.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели, зарегистрированные в Республике Беларусь, а также иностранные граждане, иностранные юридические лица, иностранные организации, не являющиеся юридическим лицом, созданные в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, подавшие заявление на участие в аукционе (по установленной форме), предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка и заключившие с Продавцом соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по установленной форме).

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметом аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить:**

• +375 17 506 92 11 • +375 29 113 79 43 • e-mail: raps92@yandex.ru

Минский городской центр недвижимости

## УП «Минский городской центр недвижимости»

**16 июля 2014 г. ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН № 06-Сф-14**
**по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).

**Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляются 22 земельных участка для строительства и обслуживания одноквартирных блокированных жилых домов в г. Минске (в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме):

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | пер.Грибной, 15 (Заводской район) | 500000000002008271 | 0,0545 | 460 475 470 | 69 000 000 | 8 568 882 |
| 2. | проектируемый проезд № 3 в бывшей деревне Масюковщина (Фрунзенский район) | 500000000006007162 | 0,0707 | 808 852 590 | 121 000 000 | 8 194 758 |
| 3. | проектируемый проезд № 3 в бывшей деревне Масюковщина (Фрунзенский район) | 500000000006007161 | 0,0985 | 1 126 899 930 | 169 000 000 | 8 194 758 |
| 4. | пер. 1-й Артема, 17 (Заводской район) | 500000000002007983 | 0,0590 | 471 860 520 | 70 000 000 | 4 927 614 |
| 5. | ул. Таежная, 45 (Партизанский район) | 500000000001033858 | 0,0512 | 417 290 750 | 62 000 000 | 5 148 923 |
| 6. | ул. Сеченова, 33 (Заводской район) | 500000000002008252 | 0,0492 | 412 097 700 | 62 000 000 | 8 194 758 |
| 7. | ул. Ангарская, 219 (Заводской район) | 500000000002008251 | 0,0580 | 485 800 950 | 73 000 000 | 8 194 758 |
| 8. | пер. Братский, 29 (Заводской район) | 500000000002008248 | 0,0541 | 453 135 450 | 68 000 000 | 8 194 758 |
| 9. | ул. Охотская, 166 (Заводской район) | 500000000002008250 | 0,0473 | 396 176 700 | 60 000 000 | 8 194 758 |
| 10. | ул. Охотская, 138 (Заводской район) | 500000000002008249 | 0,0449 | 376 074 150 | 56 000 000 | 8 194 758 |
| 11. | ул. Ангарская, 213 А (Заводской район) | 500000000002008103 | 0,0564 | 442 985 400 | 66 000 000 | 6 530 359 |
| 12. | ул. Фучика, 7 (Заводской район) | 500000000002007565 | 0,0574 | 453 454 720 | 68 000 000 | 2 134 249 |
| 13. | пер. Грибной, 46/19 (Заводской район) | 500000000002008105 | 0,0477 | 374 645 700 | 56 000 000 | 6 791 106 |
| 14. | проезд Енисейский, 7 (Заводской район) | 500000000002008102 | 0,0478 | 375 460 800 | 56 000 000 | 5 761 190 |
| 15. | ул. Чекалина, 49 (Заводской район) | 500000000002008104 | 0,0440 | 345 602 400 | 56 000 000 | 6 100 140 |
| 16. | пер. 2-ой Радиаторный, 16 (Фрунзенский район) | 500000000006007289 | 0,0826 | 1 231 966 610 | 185 000 000 | 8 194 758 |
| 17. | пер. 2-ой Радиаторный, 17 (Фрунзенский район) | 500000000006007195 | 0,0754 | 1 124 579 690 | 169 000 000 | 8 194 758 |
| 18. | Земельный участок № 1 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005469 | 0,0754 | 883 064 750 | 132 000 000 | 2 168 213 |
| 19. | Земельный участок № 22 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005076 | 0,0736 | 861 990 290 | 129 000 000 | 1 864 388 |
| 20. | Земельный участок № 23 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005482 | 0,0733 | 858 469 250 | 129 000 000 | 2 168 213 |
| 21. | Земельный участок № 27 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005372 | 0,0700 | 819 824 110 | 123 000 000 | 1 864 388 |
| 22. | Земельный участок № 32 (по генплану) в квартале улиц Папернянской – Иодковской – Проектируемой № 1, 3 (Советский район) | 500000000008005371 | 0,0638 | 747 211 290 | 112 000 000 | 1 864 388 |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

**Условия, предусмотренные в решении Минского горисполкома о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:**

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

